Пролетарыя усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу (іншагародняя)	— 20 к.
месцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок палярэдні пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок палярэдні пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок палярэдні перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпецыяльны на 50 проц. даражэй.

Зьнак тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і інвалідам: за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 169 (2357) Аўторак, 24-га ліпеня 1928 г.

VI кангрэс Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА І ЗАДАЧЫ КАМІНТЭРНУ.

СПРАВАЗДАЧА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ.

ДАКЛАД тав. БУХАРЫНА.

Нашы асноўныя задачы і нашы недахопы.

МАСКВА, 22-УП. У пачатку свайго дакладу Бухарын даў вычэрпываючы агульны аналіз сучаснага капіталізму і асаблівых формаў капіталістычнага крызісу, адзначыўшы абвастрэньне ўнутраных супярэчнасьцяй у буржуазных краінах і ўзмацненьне ў гэтых краёх клясавай барацьбы. Далей тав. Бухарын пераходзіць да пытаньня аб асноўных задачах Камінтэрну і недахопах у працы Камінтэрну. Раней усяго т. Бухарын затрымліваецца на пытаньні аб інтэрнацыянальнасьці рэвалюцыйнага руху.

Больш інтэрнацыянальнасьці.

Само сабой зразумела, сёньешні пэрыяд, калі ў асяродку ўвагі кампартыяў стаяць пытаньні вялікай палітыкі, калі ваенная праблема выяўляецца цэнтральнай праблемай, у аснове дзейнасьці Камуністычнага Інтэрнацыяналу павінна быць пастаўлена пытаньне аб міжнародным узгадаваньні і аб усіх зьвязаных з гэтым задачах камуністычных партый. Разглядаючы нашу партыйную дзейнасьць з гэтага пункту гледжаньня, трэба адзначыць, што, ня гледзячы на параўнаўчую малалічнасьць нашых камуністычных партый, усё-ж такі безсумніву мы дасягнулі досыць вялікіх посьпехаў у сэнсе бальшавізацыі кампартый, мы зрабілі даволі вялікія завабёвы, мы можым канстатаваць рост нашага ўплыву, мы ідэолёгічна заваявалі новыя тэрыторыі для камунізму і г. д. Тым ня менш ступень інтэрнацыянальнасьці кампартый усё-ж занадта малая ў параўнаньні з задачамі, якія стаяць перад Камуністычным Інтэрнацыяналам і яго сэкцыямі.

Досьлед апошніх гадоў выявіў гэтыя недахопы, і я думаю, што наш доўг—зусім шчыра аб гэтым выказацца. Разам з тым шчырае прызнаньне гэтага факту зьяўляецца галоўнейшай прадпасылкай для ўдаленьня гэтага недахопу. У часе ангельскай забастоўкі мы канстатавалі,—гэта зафіксавана і ў рэзалюцыях пашыраных пленумаў Камуністычнага Інтэрнацыяналу,—што шмат якія партыі недастаткова падтрымалі ангельскую работніцкую клясу. За выключэньнем некаторых партый, і ў першую чаргу ВСеКП(б), усе іншыя партыі дапамаглі ангельскаму пралетарыяту ў малой ступені. У часе кітайскіх падзей выявілася тое самае. Размах міжнароднай кампаніі абароны кітайскае рэвалюцыі ня вусім адказваў аб'ектыўным вымогам гэтага пэрыяду і рэвалюцыйнаму доўгу партыі.

Інтэрас кітайскай рэвалюцыі быў недастаткова выказаны. Што тычыцца прэсы, то і яна ня мела дастатковай інфармацыі па бальшавізацыі кітайскай камуністычнай партыі, аб бальшавізацыі работніцка-сялянскага руху ў Кітаі. Ня відаць было больш-менш глыбокай і сыстэматычнай працы ў гэтай галіне, не праводзілася ў адпаведным маштабе шырокая палітычная кампанія. Былі зроблены розныя спробы да выдаленьня гэтых недахопаў, але не хапала ўпартай, сыстэматычнай працы і ў выніку партыі ў пэрыяд вялікіх кампаніяў не заўсёды знаходзіліся на сваёй вышыні.

У абарону СССР і рэвалюцыі ў Кітаі.

Возьмем далей гэткае пытаньне, як пытаньне аб фашызьме. Я маю на мэце тут ня толькі італьянскі фашызм,—я стаўлю гэта пытаньне некалькі шырэй, гэтак значыць бяру пытаньне аб фашызьме ў Італіі, аб фашызьме ў Польшчы і аб фашызьме наогул. Барацьба кампартый супроць фашызму, увага да гэтага пытаньня была зусім недастатковай. Такія падзеі, як наступленьне ПАЗШ на Нікарагуа, ня выклікалі дастатковай рэакцыі ў першую чаргу в боку амэрыканскай кампартыі. Калі брацкая амэрыканская кампартыя, для якой гэта пытаньне павінна было быць цэнтральным ва ўсей яе працы, была не ў стане разгарнуць у належных памерах адпаведную кампанію, дык ня ў меншай ступені адносіцца гэта і да іншых партый.

Нікарагуа знаходзіцца далёка ад Эўропы. Але геаграфічныя ўмовы не павінны граць рашаючай ролі ў працы кампартыі. Тут у некаторых партыях—асабліва ў Эўропе—як у малых так і ў вялікіх заўважаецца яшчэ пэўныя астачы правінцыялізму, некаторыя прабелы ў разуменьні значэньня вялікай міжнароднай палітыкі; калі мы сапраўды павінны сур'ёзна рыхтавацца да такіх сусьветна-гістарычных падзей, як будучая вайна, то мы ў сёньешні пэрыяд павінны зрабіць націск на пытаньнях вялікай міжнароднай палітыкі,—інакш мы будзем не ў стане падрыхтавацца да вайны.

Само сабой зразумела, дзеля таго, каб добра правесьці гэту кампанію, каб разгарнуць яе з належнай энэргіяй, мы павінны ўвязываць пытаньні вялікай інтэрнацыянальнай палітыкі з пытаньнямі штодзённага жыцьця і рэвалюцыйнай працы ў адпаведных краінах. Тут ізноў-жа на сцэну выплывае праблема вайны. Амаль усе ўнутраныя партыйныя пытаньні, у тым ліку і пытаньні работніцкага руху ў кожнай краіне, упіраюцца ў гэту праблему. Наступленьне капіталу зьвязана з падрыхтоўкай буржуазеі к вайне і выклікана неабходнасьцю і патрэбай умацавацца на сваіх пазіцыях, устанавіць грамадзянскі мір, стварыць гарантыю супроць рабочых і г. д. Гэта наогул вельмі складаная праблема. Неабходна, выходзячы ад штодзённых пытаньняў, у той-жа час зрабіць іх асновай далейшага разьвіцьця нашых больш агульных лёзунгаў і задач. У гэтым заключаецца пэўная палітыка—тактычнае мастацтва. Але—гэта аргумэнт на карысьць пастаноўкі вялікіх палітычных пытаньняў, менавіта ў гэтым хаваецца мастацтва бальшавіцкай тактыкі: выходзячы з дробязяй, высоўваць вялікія пытаньні. Калі мы гэтага мастацтва не зразумеем, калі мы ня будзем у дастатковай меры рэагаваць на вялікія інтэрнацыянальныя пытаньні, то гэта будзе азначаць, што мы ня будзем весьці сыстэматычнай працы па падрыхтоўцы да барацьбы з вайной. Гэта мы павінны зразумець і зафіксаваць у нашай рэзалюцыі. Пытаньне аб вайне, пытаньне аб абароне рэвалюцыі ў СССР і ў Кітаі—гэтыя пытаньні маюць цэнтральнае, рашаючае значэньне. Сыстэматычная праца ў гэтым напрамку зьяўляецца цэнтральнай задачай усіх партый, усіх сэкцый Камуністычнага Інтэрнацыяналу ў сваіх краёх.

Пытаньне агульнай лініі кампартыі ёсьць пытаньне аб адносінах да сёньешняй формы капіталізму і капіталістычнай дзяржаве. І ў гэтай краіне маленькія пытаньні няпрыкметна перарастаюць у вялікія палітычныя праблемы. Калі мы, напрыклад, возьмем тактычную арыентацыю сац.-дэмакратычных партый,—аб гэтым я мімаходам ужо казаў,—то мы натыкаемся на вусім пасьлядоўную лінію.

Гэта—лінія аб'яднаньня з прадпрыёмчымі арганізацыямі. Яна праходзіць ад паасобнай фабрыкі да Лігі Нацый. Сацыял-дэмакраты вядуць прапаганду «прамысловага міру» і так званага „амэрыканскага" мэтаду супрацоўніцтва між працай і капіталам. Гэткая аснаўная лінія сёньешняй сац.-дэмакратыі. Гэты аснаўны курс знаходзіць сваё адбіцьцё і ў галіне замежнай палітыкі. Але з ім-жа мы стыкаемся ў пытаньнях унутранай палітыкі, у пытаньні аб узаемаадносінах з дзяржавай, у пытаньні аб кааліцыі, аб адносінах да так зв. арганізацый „работадаўцаў", г. зн. магнатаў **трэставага капіталу**. Сац.-дэмакратычны лёзунг ёсьць лёзунг яднаньня з трэставым капіталам. Пытаньня аб клясавай барацьбе для іх больш ня існуе.

У эканамічнай галіне яны супроць забастовак, супроць эканамічнай барацьбы, у зьмену іх—прамысловы мір; заместа абвастрэньня забастовак—прымусовы арбітраж. Пытаньне аб самастойнасьці ці несамастойнасьці работніцкіх арганізацый заменены пытаньнем аб супрацоўніцтве гэтых работніцкіх арганізацый з прадпрынімаўчымі. Гэта—цэлая тактычная сыстэма.

Работніцкія арганізацыі, з пункту гледжаньня рэфармізму, павінны згубіць сваю клясавую самастойнасьць; клясавая барацьба для гэтых паноў «састарэлася». Лінія сац.-дэмакратыі ёсьць лінія не зрашчэньня рэфармісцкіх работніцкіх арганізацый з арганізацыямі манапольнага капіталу і манапольна-капіталістычнай дзяржавы. Па ўсім фронце мы бачым гэтую пасьлядоўную тактыку, якую праводзіць сацыял-дэмакратыя.

Тактыка адзінага фронту—толькі зьнізу.

Якая-ж наша тактычная арыентацыя? У нас вусім адваротная тактычная арыентацыя ва ўсіх гэтых пытаньнях, пачынаючы ад вытворчай ячэйкі да Лігі Нацыі. Гэта цалкам антаганістычная ў адносінах да сац.-дэмакратыі арыентацыя. Не прамысловы мір, а клясавая барацьба, не арбітраж, а барацьба супроць прымусовага арбітражу, барацьба супроць усіх тых пацугоў, якія накладаюцца капіталістычнымі арганізацыямі ці капіталістычнай дзяржавай, барацьба супроць зьвязываньня на руках і нагах забастовачнага руху і г. д.

Вось наша аснаўная тактычная арыентацыя. Мы гэтыя пытаньні ўжо і раней абгаварвалі, і адказ на іх, намойму, вусім ясны. Апошні вывад з гэтай тактычнай лініі—курс на разрыў буржуазнай дзяржаўнай улады, курс на рэвалюцыю. Гэта наша лінія ні ў якім выпадку не азначае адмены тактыкі адзінага фронту. Але, у сувязі з абвастрэньнем нашай барацьбы супроць сац.-дэмакратыі, мы павінны ўнесьці ў гэтую барацьбу наступныя вьмены; Тактыку адзінага фронту павінны весьці ў большасьці выпадкаў толькі **зьнізу**. Ніякіх апэляцый да цэнтраў сац.-дэмакратычных партый,—толькі ў рэдкіх выпадках могуць быць дапушчаны апэляцыі да асобных мясцовых арганізацый сац.-дэмакратычнай партыі. Але ў аснове—апэляцыя да сац.-дэмакратычных масаў, да простых сац.-дэмакратычных работнікаў.

Тактыка адзінага фронту шчыльна зьвязана з пытаньнямі сыстэматычнай працы, якую мы праводзім.

За максымальную рознастайнасьць і гнуткасьць у мэтадах працы.

У гэтай галіне, «галіне сыстэматычна правадзімай намі працы» важнейшаю праблемаю зьяўляецца праца ў прафсаюзах. Адзначыўшы недахопы ў гэтай галіне (недастатковы і нязначны аўтарытэт адказных кіраўнікоў прафпрацы, адсутнасьць спэцыфічнабальшавіцкае пастаноўкі прафсаюзных праблемаў, «хвасьцізм»—г. зн. адсутнасьць ініцыятывы, няўменьне ажыцьцёвіць кіраўнічую ролю ў стачачным руху і г. д.) тав. Бухарын зазначае, што неабходна дамагацца рознастайнасьці мэтадаў працы, гнуткасьці мэтадаў працы, бо праблема моладзі ёсьць адна з важнейшых праблем нашага часу.

Больш увагі сялянскаму пытаньню.

Далей мы павінны згуртаваць больш увагі,—гаворыць потым Бухарын—на сялянскім пытаньні, і з гэтага пункту гледжаньня мы павінны дапамагчы Сялянскаму Інтэрнацыяналу ператварыцца ў сапраўдную жывую арганізацыю. Я не магу падаць вам справаздачу аб дзейнасьці гэтае арганізацыі, але я павінен сказаць, што яна мае больш менш прапагандысцкі характар, што яе праца складаецца, галоўным чынам, з выданьня розных матар'ялаў,—арганізацыйная сувязь яе вельмі недастатковая. Колькаснасьць гэтае арганізацыі вельмі нязначная, хоць яна і мае некаторыя посьпехі. Я думаю, што ў гэтым вінаваты ня толькі Сялянскі Інтэрнацыянал, але і Камінтэр, што тут наша калектыўная віна. Мы ня выдзелілі для гэтае арганізацыі патрэбных сіл, мы не зьвярнулі на яе працу больш увагі. Аб гэтым яўна сьведчаць румынскія падзеі і вынікі выбараў у Францыі і ў Нямеччыне. Гэтае пытаньне мы павінны паставіць у бліжэйшай будучыне і зрабіць усё, каб дамагчыся іх паленшаньня. І такім чынам, калі мы будзем правільна ўжываць тактыку адчайнага фронту прафпрацы, у юнацкіх і блізкіх арганізацыях да іх, мы здолеем зьнішчыць неадпаведнасьць між ростам нашага палітычнага ўплыву і яго арганізацыйным замацаваньнем. У зьвязку з гэтым я хацеў-бы яшчэ закрануць некаторыя нашы недахопы.

Сымптомы бюракратызму.

Мне здаецца, што за апошні час ня толькі ў нашай партыі, УсеКП(б), але і ў шмат іншых партыях узмацніліся сымптомы бюкратызму. Зразумела, гэтую небясьпеку на трэба пераўвялічваць, але яе неабходна сьцьвердзіць. Гэта знаходзіцца ў сувязі з цэлым шэрагам вельмі складаных праблемаў унутрыпартыйнага жыцьця. Неабходна адзначыць недастаткова жывы пульс унутрыпартыйнага жыцьця, асабліва ў нізавых пластох партыі, вытворчых ячэйках і г. д. Гэта неабходна сьцьвердзіць, каб паленшыць становішча рэчаў. Яшчэ некалькі слоў аб культурна-палітычным узроўні нашых партый, нашых партыйных кадраў. Кожны далейшы крок па шляху разьвіцьця нашае партыі патрабуе ад нас паглыбленьня нашага палітычнага разважаньня, абдуманага лавіраваньня і маневраваньня і рэагаваньня на кожную новую сітуацыю. Гэта—адна з важнейшых праблемаў. На мой погляд, мы павінны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу нашаму творчаму ўзроўню, лепшай пастаноўцы нашага друку і ўзьвядзьцю вучобы ў нашых партыях.

Ухілы ў Камуністычным Інтэрнацыянале

Правы ўхіл.

Цяпер, таварышы, некалькі слоў наконт рознага роду ўхілаў у Камуністычным Інтэрнацыянале. Некаторы час таму назад, галоўная небясьпека ў Камуністычным Інтэрнацыянале пагражала з боку г. зв. «ультра-левых», якія спрабавалі стварыць інтэрнацыянальную арганізацыю. Пасьля паражэньня апазіцыі ВсеКП(б) гэтыя спробы былі разьбіты, але самы працэс разгрому апазіцыі, кульмінацыйным пунктам якога зьявіўся развал г. зв. «ленінбунда»,—гэты працэс прымушае нас зрабіць для сябе некаторыя вывады. Мы заявралі, што трацкізм ёсьць сацыял-дэмакратычны ўхіл. Некаторыя з таварышоў у глыбіні душы лічылі гэта вялікім пераўвялічэньнем. Але гісторыя ленінбунда паказала, што ядро апазіцыі перайшло да сацыял-дэмакратаў. Ці было гэта выпадкова. Не, гэта зьявішча не выпадковае. Мы ясна бачым дыялектыку ўзаемадачыненьняў паміж г. зв. «ультра-левымі» і правымі. Цэнтральную небясьпеку цяпер яўляе правы ўхіл, калі ўзяць Камуністычны Інтэрнацыянал у цэлым. Гэты правы ўхіл выявіўся і ў ігнараваньні неабходнасьці завастрэньня клясавае барацьбы, напрыклад, у часе стачак, у неправіднёваньні стачак, дзе трэба было іх правесьці. Гэты ўхіл выявіўся і ў памылковай лініі ў адносінах сацыял-дэмакратыі, у недастатковым завастрэньні барацьбы проці «левых» правадыроў сацыял-дэмакратыі. Выяўляецца гэта і ў недастатковым інтэрнацыяналізьме партыі. Той-жа ўхіл відаць і ў профпрацы, дзе агульная профдысцыпліна ставіцца іншы раз вышэй нашае партыйнае дысцыпліны.

Левыя ўхілы.

Неразуменьне правільных узаемадачыненьняў паміж партыяй і прафсаюзам прыводзіць да таго, што партыя іншы раз непасрэдна камандуе масамі ў якасьці камуністычнага авангарду, ня імкнучыся ўмацаваць, не праводзячы сыстэматычнае працы. Выкрываюцца і некаторыя тэндэнцыі да адмовы ад тактыкі адзінага фронту наогул. У сэнсе няправільнае пазіцыі ў адносінах да сацыял-дэмакратаў мы маем шэраг навочных прыкладаў, якія памылкі ўчынены многімі партыямі ў Нямеччыне, у Францыі, у Чэха-Славакіі і інш. Гэта няправільныя палітычныя ўхілы іншы раз набывалі форму няверных лёзунгаў, так, напрыклад, і галоўным чынам у Нямеччыне, дзе некаторыя таварышы высунулі лёзунг кантролю над вытворчасьцю ў той час, калі ў наяўнасьці ня было адпаведнае рэвалюцыйнае сітуацыі: аб'ектыўна гэта зьяўлялася нічым іншым, як крокам па шляху сацыял-дэмакратычнае тактыкі „гаспадарчае дэмакратыі", па шляху далучэньня да сыстэмы «міру ў прамысловасьці». Таму, без наліччя рэвалюцыйных абставін правільны і рэвалюцыйны лёзунг ператвараецца ў сваю процілегласьць. Але тады ён перастае быць толькі няправільным лёзунгам, а ўжо сыгналізуе цалкам няправільную палітычную лінію. Гэтая правая небясьпека зараз высоўваецца на першы плян перад намі, і вусім зразумела, што пасьля таго, як мы разьбілі трацкісцкую апазіцыю, мы павінны заняць вусім пэўную лінію супроць гэтых правых ухілаў і маленькіх правых апазіцыйных групак. Зараз мы павінны крытычна і ў сапраўдным іх выглядзе разгледзець таксама іншыя нашы недахопы. У некаторых партыях, і нават у досыць вялікай колькасьці іх, мы бачым, напрыклад, што яны не прызвычайваюцца да новага становішча і наогул ня бачаць, што адбылося нешта новае. Гэта здарылася, напрыклад, у Францыі, калі ва ўладзе апынуўся Пуанкарэ. Падобны-ж прыклад мы маем і ў Англіі, калі рабочая партыя і генэральная рада зрабілі круты паваро́т. Яшчэ другі прыклад мы бачылі ў тэй-жа Англіі, калі надышла новая паласа ў суадносінах грамадзкіх сіл.

Недастатковы падлік канкрэтных абставін.

Такім чынам, у адносінах амаль ні да кожнае партыі прыходзіцца амаль бяз выключэньня сьцьвярджаць, што яна вельмі позна рэагуе на зьмены становішча. Становішча ўжо зьмянілася, а партыя адразу не рэагуе, ці рэагуе вельмі позна, вельмі позна даюць дырэктыўныя лёзунгі і г. д. Мне здаецца, што гэта датычыць і Камінтэрну і яго кіраўніцтва; Камінтэрн не заўсёды своечасова неадкладна рэагуе на новыя абставіны, на новыя падзеі, на зноў створанае новае становішча. Дырэктыўныя лёзунгі не заўсёды даюцца своечасова, мы не заўсёды пасьпяваем з нашай працай, калі трэба высунуць агульныя асноўныя лёзунгі. Далей—да гэтае пары партыі яшчэ не навучыліся ўвязваць пытаньні штодзённае працы з нашымі галоўнымі мэтамі і задачамі. Мы ці гучна крычым аб сусьветных праблемах і нічога ня робім для вырашэньня штодзённых пытаньняў, ці застаёмся на грунце штодзённых пытаньняў і забываем аб тым, што іх трэба ўвязваць з буйнымі палітычнымі пытаньнямі. Я так шмат казаў аб недахопах для таго, каб мы іх дзеславіта крытыкавалі, і мне здаецца, што з тае прычыны, што з часу апошняга кангрэсу мінуў даволі доўгі пэрыяд, дык павінны падкрэсьліць гэтыя нашы недахопы і слабыя бакі, таксама і ў адносінах нашага Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Проці фракцыйнасьці.

Далей я павінен падкрэсьліць яшчэ нешта іншае, праўда стаячае больш ці менш у баку ад данага пытаньня, але ўсё-ж маючага вялікае значэньне ва ўсім жыцьці камуністычных партый. Я маю на ўвазе **фракцыйную барацьбу, якая вядзецца без патрэбных палітычных падстаў і дастатковага палітычнага апраўданьня.** Асноўныя прычыны гэтага зьявішча вельмі складаныя; часткова яны зьвязаны з гістарычнымі традыцыямі. У некаторых партыях небясьпека фракцыйнае нязгоды такая вялікая, што па маёй думцы, прыдзецца ўжыць шмат надзвычайных мер для барацьбы з ёю. Дазвольце зазначыць на два такіх прыклады. Таварышы, я не таму так многа гаварыў аб нашых недахопах, што лічу агульнае становішча і агульныя прадпасылкі для нэпае дзейнасьці нездавальняючымі, ці няспрыяючымі. Зусім наадварот, па буйных палітычных пытаньнях, па пытаньні аб небясьпецы вайны, па пытаньні аб выхадзе з становішча, якое стварылася на аснове супярэчнасьцяй унутры капіталізму,—мы маем усё больш і больш спрыяючую глебу сярод усяе рабочае клясы.

Уперад да барацьбы, да перамог.

Наш пераважны ўплыў у калёніяльных краінах бясспрэчны, ён нават бясспрэчны ў такой краіне, як Кітай; напярэдадні таго, што ён будзе бясспрэчным і ў такой краіне, як Індыя, мы набываем бясспрэчны ўплыў і сярод рабочае клясы заходня-эўрапейскіх краін, ставячы перад імі з усёй шырынёю такія буйныя пытаньні, як пытаньне аб небясьпецы вайны. І таму абвастрэньнем агульных супярэчнасьцяй і абвастрэньнем супярэчнасьцяй унутры капіталізму, абвастрэньнем клясавае барацьбы, г. зн. у зьвязку з умовамі, якія зараз аб'ектыўна ўпаўне маюцца ў наяўнасьці, ствараецца спрыяючая глеба і спрыяючыя пэрспэктывы для нашае працы, спрыяючыя пэрспэктывы для нашых посьпехаў. Няма ніякіх падстаў гаварыць, што тэхнічны прагрэс, тэхнічнае ўмацаваньне капіталістычнага арганізму, працэс стабілізацыі капіталізму зламае нам шыю, як прадказваюць сацыял-дэмакраты. Наадварот, чым больш абвастраюцца гэтыя супярэчнасьці, няўхільна ўласьцівыя сучаснаму становішчу, тым больш пашыраецца і ўмацоўваецца глеба пад іх нагамі. Пакуль мы вучымся, а мы зразумела ў выніку навучымся,—увязваць нашу штодзённую працу з буйнымі палітычнымі запытамі, дык мы ахопім шырокія масы рабочае клясы заходня-эўрапейскіх краін, мы падначалім свайму ўплыву рабочы рух у буйных капіталістычных дзяржавах і здолеем увязаць іх з сапраўды магутным і маючым гістарычнае значэньне рухам прыгнечаных народаў. І калі наблізіцца гадзіна, у якую ўзьнімуцца таямнічыя сьцягі імпэрыялізму, наш Камуністычны Інтэрнацыянал, усе нашы партыі, шырокія масы працоўных усяго сьвету скажуць сваё слова. Гэта слова будзе лёзунгам грамадзянскае вайны, лёзунгам барацьбы супроць імпэрыялізму не на жыцьцё, а на сьмерць, яно будзе пераможным поклічам Камуністычнага Інтэрнацыяналу. (Гучныя воплескі, якія пераходзяць у авацыю. Дэлегаты ўстаюць і сьпяваюць Інтэрнацыянал).

ПАЗІЦЫЯ ЯПОНСКАГА ЎРАДУ АДНОСНА КІТАЮ.

ШАНХАЙ, 22-7. Па паведамленьню агэнцтва Ніпон Дэмпо, у адказе японскага ўраду на ноту нанкінскага ўраду, які паведамляе аб спыненьні часу дзеяньня кітайска-японскага гандлёвага дагавору, гаворыцца: 1) 26 артыкул дагавору прадугледжвае адно «перагляд», а не „анулываньне" дагавору, дзеля гэтага японскі ўрад лічыць ноту нанкінскага ўраду незаконнай; 2) нота нанкінскага ўраду адкрыта пагаджае міжнароднымі звычаямі і даверам, дзеля гэтага японскі ўрад засьцерагаецца, што яна пашкодзіць міжнароднаму становішчу ўраду; 3) дзеля таго, што японскі ўрад спачувае імкненьню Кітаю, маючаму на мэце паляпшэньне ўнутранага і міжнароднага становішча краіны, ён, як і раней, з незьменнай добрай воляй згодзен весьці перамовы аб пераглядзе дагавору, згодна з прапановамі кітайскага ўраду; 4) аднак, калі нанкінскі ўрад, не зважаючы на міжнародныя звычаі, ня зьменіць сваей пазіцыі і будзе дамагацца каб парушыць артыкул дагавору, які не прадугледжвае анулываньня яго, і ўвядзе часовыя правілы для японскіх гр-н у Кітаі, японскі ўрад можа быць прымушаным ужыць адпаведныя мерапрыёмствы для аховы сваіх правоў, інтарэсаў і становішча ў Кітаі.

ЯПОНІЯ ПРОЦІ ПЕРАГЛЯДУ КІТАЙСКА-ЯПОНСКАГА ДАГАВОРУ.

ТОКІЁ, 22-7. Агэнцтва Сымбон Рэнго паведамляе: «Японскі ўрад паслаў адказ на ноту кітайскага нацыяналістычнага ўраду, заяўляючую аб спыненьні дзеяньня кітайска-японскага дагавору. У адказе сказана, што Японія разглядае заяву кітайскага ўраду, як незаконны акт і заяўляе аб сваёй рашучасьці прадпрыняць неабходныя мерапрыёмствы для аховы сваіх правоў і інтарэсаў у Кітаі, калі нацыяналістычны ўрад парушыць умовы старога дагавору. У інтэрв'ю з прадстаўнікамі друку японскі прэм'ер Танака між іншым, заявіў: „Калі нацыяналістычны ўрад у сапраўднасьці паставіць пад пагрозу дагаворныя правы Японіі ў Кітаі, японскі ўрад палічыць сябе вынушаным зрабіць захады, якія дыктуюцца абставінамі". Прэм'ер выказваў надзею, што нацыяналістычны ўрад не пяройдзе межы разважнасьці пры выдзейсьненьні сваёй праграмы.

ЗРЫЎ ДЫПЛЁМАТЫЧНЫХ ЗНОСІН МІЖ КІТАЕМ І ЯПОНІЯЙ.

ШАНХАЙ, 22-УП. Па паведамленьню пекінскага карэспандэнта агэнцтва Ніпон Дэмпо, пасол Японіі ў Кітаі Іосізава і іншыя члены японскай місіі перарвалі ўсялякую афіцыяльную сувязь з кітайскімі ўладамі. Такім чынам—паведамляе агэнцтва—дыплёматычныя зносіны між Кітаем і Японіяй часова перарваны. Па вестках агэнцтва Рэйтэра, усе палітычныя колы зьвярнулі асаблівую ўвагу на адступнасьць Іосізавы на прыёме членаў дыплёматычнага корпусу і іншых відных чужаземцаў, наладжаным учора ў Пекіне жонкай Чан-Кай-Шы.

У Саюзе ССР.

Тав. Сталін на Волхаўскай станцыі.

ЛЕНІНГРАД, 19-УП. Тав. Сталін у часе свайго знаходжаньня ў Ленінградзе наведаў Волхаўскую гідра-электрычную станцыю, у працягу 3-х гадзін падрабязна аглядаў яе і знаёміўся з працаю. Растлумачэньні тав. Сталіну даваў будаўнік Волхаўстрою—Графтыё.

Аб кантрактацыі сяўбы ўвосень 1928 г.

Апублікавана пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР, аб кантрактацыі сяўбы зернавых культур у асеньнюю пасеўную кампанію 1928 г.

У мэтах гэткай арганізацыі збыту зернавой прадукцыі,—гаворыцца ў пастанове—якая-б спрыяла сялянству ў паляпшэньні яго сельскай гаспадэркі, пашырэньне сяўбы пад азімымі зярновымі культурамі і падняцьце ўраджайнасьці, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастаноўляе: 1) прызнаць неабходным у азімую кампанію 1928 г. правесьці кантрактацыю сяўбы чыстагатунковага і радавога збожжа на плошчы 5 міліёнаў гэктараў (у тым ліку 400 тысяч гэктараў чыстагатунковай сяўбы па наступнаму разьмеркаваньню: па РСФСР—3 міліёны 600 тысяч гэктараў, УССР—1 міліён 250 тысяч. Сярэдняй Азіі—100 тысяч, БССР—25 тысяч, Закаўказкай ССР—25 тысяч.

Уся кантрактацыя радавога збожжа праводзіцца выключна праз сыстэму безгаспадарчай каапэрацыі з рэалізацыяй усяго збожжа, якое атрымліваецца па кантрактацыі на пляну Наркамгандлю СССР. Пры кантрактацыі вытворцам выдаюцца авансы з зборам падатку 6 проц. гадавых. Памер авансаў не павінен пераважаць у сярэднім 8 руб. на гэктар. Пры кантрактацыі сяўбы павінны быць абумоўлены здачы вытворцамі ўвосень 29 году таварных лішкаў закантрактаваных плошчаў на суму ня менш 200 проц., выданых пры кантрактацыі авансаў.

Для фінансаваньня кантрактацыі ў суадказнасьці з цяперашняй пастановай прадугледзіць у адзіным дзяржбюджэце СССР на 1928-29 год асыгнаваньне ў разьмеры 30 міліёнаў руб. з выдачай гэтай сумы ў першым квартале бюджэтнага году.

10 год з дня ліквідацыі Савінкаўскага паўстаньня.

ЯРАСЛАЎЛЬ, 23-VII. Мінула 10 год з дня ліквідацыі Савінкаўскага мяцежу. За свае 16-цідзённае валадаротва белыя разбурылі і спалілі палову гораду, пакінуўшы без страхі 40 тысяч чалавек. У сучасны момант удалося адбудаваць больш паловы зьнішчаных гмахаў. На месцы былых згарышчаў вырастаюць работніцкія пасёлкі.

Дзень ліквідацыі мяцежа абвешчаны на губерні непрацоўным днём, праведзены пад лёзунгам умацаваньня абароны.

20 новых самалётаў.

У нядзелю 22-га ліпеня на цэнтральным маскоўскім аэрадроме адбылася ўрачыстая перадача Чырвонай арміі 20 самалётаў, пабудаваных спажывецкай каапэрацыяй, кіно-працаўнікамі і інш. арганізацыямі.

3-я ўсесаюзная лётарэя ТДА-Авіяхіму.

Саюзны Савнарком дазволіў ТДА-Авіяхіму СССР адкрыць з 1-га лістападу 1928 г. па 1-га чэрвеня 1929 г. 3-ю ўсесаюзную лётарэю ТДА-Авіяхіму, усяго на суму 2 міліёны рублёў з колькасьцю білетаў на 4 міліёны.

Пераход на чурбскі альфабэт.

БАКУ, 21-УП. Азэрбайджанскі ЦВК пастанавіў 1-га студзеня 1929 г. усё дзеловодства па ўсіх дзяржаўных і грамадзкіх арганізацыях перавесьці на новы чурбскі альфабэт. Кіраўнікі ўстаноў, адказныя працаўнікі, тэхнічныя служачыя дзяржаўных і грамадзкіх устаноў павінны вывучыць да 1-га студзеня новы альфабэт у парадку самаадукацыі. Усім дзяржаўным органам і ўстановам запрапанавана звольніць з працы асоб, якія вывяць пасьля вызначанага тэрміну няведаньне новага альфабэту.

Спатканьне Самойлавіча з Нобіле.

22-га ліпеня камітэт дапамогі «Італіі» атрымаў ад прафэсара Самойлавіча данясеньне аб яго пабачаньні з Нобіле,—у выніку пераконваючай просьбы Нобіле адведаць яго, бо з-за паламанай нагі ён не выходзіць з каюты, —паведамляе праф. Самойлавіч,—я пашоў разам з Вільеры на «Чыта-ды-Мілано». Нобіле ў прыгнечаным настроі, нэрвовы. Ён прасіў дазволу прыняць удзел у далейшых працах «Красіна». Я паведаміў, што маю дазвол узяць яго на борт. На «Чыта-ды-Мілано» было зроблена ў чэсьць „Красіна" сьнеданьне прамоў ня было. Нобіле ня прыймаў удзелу. Чухноўскі застаецца ў Кынгзбэі.

* * *

Камітэт дапамогі «Італіі» катэгарычна пярэчыць паведамленьню нарвэскага тэлеграфнага агэнцтва з Кынгзбэю аб тым, што „Красін" паспрабуе паправіць пашкоджаньні вінта ў Кінгзбэі пры дапамозе каманды «Чыта-ды-Мілано». 22-га ліпеня камітэт загадаў „Красіну" ісьці ў Цэрмэн.

Як Чухноўскі выкрыў групу Вільеры.

Лёдакол „Красін", 21-УП. Лятун Чухноўскі паведаміў у гутарцы з спэцыяльным карэспандэнтам ТАСС наступныя падрабязнасьці свайго палёту, у часе якога адшукаў групу Мальгрэма і Марыяні: мае спадарожнікі сьцьвярджаюць, што ім, таксама як і мне, выдалася, што на самым дёзе знаходзіліся два чалавекі; адзін з іх махаў хустнай, а ў некальких мэтрах ад іх была распластана трэцяя фігура, накшталт вялікай літары „А". Ня гледзячы на даволі незнаную вышыню палёту, я не магу сьцьвярджаць што-небудзь больш упэўнена адносна віду і становішча групы, тым больш, што відочнасьць з-за туману была кепская. Адшукаўшы групу, я паляцеў машыну да «Красіна». Калі мы, па вылічэньнях праробленага палёту павінны былі знаходзіцца на адлегласьці каля 1 міл ад „Красіна", туман так згусьнеў, што нам неўдалося пабачыць лёдакол і мы ня маглі адшукаць аэрадром. Калі мы спускаліся на канцы берагу, самалёт спаткнуўся на ільдзіны парог, прыкр

Нацыянальне на II зьезьдзе партыі.

Праграма нашай партыі, ухваленая на 2-м зьезьдзе (1903 г.), зусім ясна фармуліравала канчатковую мэту рэвалюцыйнага рабочага руху і ўмовы ажыцьцяўленьня гэтай канчатковай мэты. Праграма гаварыла аб дыктатуры пралетарыяту, г. зн. аб заваёве пралетарыятам «такой палітычнай улады, якая дасьць яму магчымасьць перамагчы эксплёататараў». Зразумела, думка гэта была выказана ў вельмі агульнай форме. Гэта зразумела: існуючая ў нас з кастрычніка 1917 г. дыктатура пралетарыяту—у той час, у 1903 г., магла быць толькі праграмай больш-менш далёкай будучыні.

На чарзе стаяла задача нізрынуцьця самаўладзтва і замены яго дэмакратычнай рэспублікай. Але зразумела, што пры гэткай рэспубліцы палітычная і эканамічная ўлада яшчэ не належыць пралетарыяту. Аднак, такая буржуазная рэспубліка была-б непараўнаўча лепшай, чымся царскае самаўладзва, бо яна дала-б шырокую магчымасьць для колькаснага і якаснага ўзмацненьня пралетарыяту, палегчыла б усебаковае разьвіцьцё клясавай барацьбы. Гэта азначала, што ў інтарэсах будучай сацыялістычнай рэвалюцыі тады, у 1903 г., рабочай клясе нашай краіны трэба было яшчэ ажыцьцёвіць рэвалюцыю буржуазна-дэмакратычную.

Якімі-ж павінны быць асновы тэй канстытуцыі, якая павінна была забясьпечыць пралетарыяту і наогул працоўным масам мінімум палітычных магчымасьцяй разьвіцьця і арганізаванасьці для далейшага змаганьня за дыктатуру пралетарыяту? Вось тыя асновы, тыя бліжэйшыя палітычныя задачы і былі ўнесены ў старую праграму партыі. У ліку гэтых бліжэйшых задач знаходзяцца і пункты, прысьвечаныя нацыянальным адносінам. Вядома, што ранейшая Расейская імпэрыя зьяўлялася «турмой народаў». Працоўныя масы розных народнасьцяй ня толькі эксплёатаваліся „сваімі" абшарнікамі і багацеямі, але і прыгняталіся як паднявольныя ў дзяржаве «чужакі». Рэвалюцыйная партыя пралетарыяту не магла не аддаваць вялікай увагі гэтаму вялікаму пытаньню. Мы і прасачым зараз, якія, уласна патрабаваньні па нацыянальнаму пытаньню партыя лічыла неабходным высунуць у сваёй праграме.

Перш за ўсё там маецца пункт аб поўнай раўнапраўнасьці ўсіх грамадзян, незалежна ад роду, рэлігіі, расы і нацыянальнасьці. Нам, у Саюзе Савецкіх Рэспублік, зьяўляецца лішнім даводзіць, што нельга адным людзям даваць прывілеі, а другіх пазбаўляць элемэнтарных правоў з-за прыналежнасьці іх да тай, а ня іншай расы або нацыянальнасьці. Такая нераўнапраўнасьць тым больш была абуражаючай, што ўсім цяжарам яна, галоўным чынам, падала на працоўных прыгнечаных нацыянальнасьцяй, бо багацеяў выручаў хабар, і яны мелі магчымасьць абыйсьці царскія законы.

Апроч таго, у праграму было ўключана патрабаваньне абласнога самакіраўніцтва «для тых мясцовасьцяй, якія маюць свае асобныя бытавыя ўмовы і склад насяленьня».

Іншымі словамі, партыя наша ўжо тады паставіла пытаньне аб аўтаноміі для краін і іншых вобласьцяў унутры краіны, у якіх гэтыя бытавыя ўмовы адрозьніваюцца ад умоў цэнтральнага райёну. У самай шчыльнай сувязі з памянёным патрабаваньнем знаходзіцца і другі пункт—аб праве карыстацца ў гутарцы і вучыцца на роднай мове. Гэта патрабаваньне было падрабязна вызначана наступнымі словамі: «Права насяленьня атрымліваць адукацыю на роднай мове, якое забясьпечваецца заснаваньнем за кошт дзяржавы і органаў самакіраўніцтва, неабходных для гэтага школ; права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай на сходах; увядзеньне роднай мовы на аднолькавых правах з дзяржаўнай ва ўсіх мясцовых, грамадзкіх і дзяржаўных установах».

Маладому пакаленьню нашага Саюзу вельмі дзіўным будзе здавацца той факт, што ў старой, дарэвалюцыйнай Расеі дзеці «чужакоў» маглі вучыцца толькі на расейскай мове, якой яны не разумелі. Нельга было зьвярнуцца ва ўрадавую ўстанову (у суд, у паштовую кантору, на чыгунку і г. д.) з пытаньнем на роднай мове, а ўжо калі зьвярнуўся, дык усё роўна адказу на зразумелай яму мове не атрымаеш. Вось чаму ўключаныя ў праграму патрабаваньні сапраўды былі неабходны шырокім працоўным масам, ідэёвым і арганізацыйным кіраўніком якіх ужо тады выступала рабочая кляса і не рэвалюцыйная партыя, якая звалася сацыял-дэмакратычнай.

Апроч усіх гэтых патрабаваньняў было яшчэ адно: «права на самавызначэньне для ўсіх нацый, уваходзячых у склад дзяржавы». Гэты лёзунг, як вядома пазьней, у часе імпэрыялістычнай вайны, а пасьля, у часы кераншчыны, адыграў вялікую ролю ў выкрыцьці ўсёй згодніцкай тактыкі меншавікоў, эсэраў і іх буржуазных гаспадароў. Адна толькі партыя бальшавікоў высунула гэты лёзунг і праводзіла яго пасьлядоўна і да канца.

Зразумела, усе гэтыя патрабаваньні не атрымалі свайго ажыцьцяўленьня ні ў першую рэвалюцыю 1905 г., калі сілы царызму заставаліся яшчэ каля ўлады, ні ў лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. Толькі Кастрычнікавая рэвалюцыя, нізрынуўшая ўладу буржуазеі і вычысьціўшая дашчэнту агідныя рэшткі дваранскага ладу, ажыцьцявіла тыя нацыянальныя адносіны, асновы якіх былі намечаны і фармуляваны 25 год назад, на II-м зьезьдзе нашай партыі.

Праўда, далёка не аднагалосна прымаліся на зьезьдзе гэтыя пункты па нацыянальнаму пытаньню. На зьезьдзе, як вядома, былі і такія, якім у хуткім часе прышлося стаць у шэрагі меншавіцкай партыі. Многія з іх наогул не разумелі значэньня нацыянальнага пытаньня і распрацоўкі яго ў партыйнай праграме. Былі сярод іх і такія, як бундаўцы, якія нацыянальную праграму хацелі будаваць не ў інтарэсах пралетарыяту і будучай дыктатуры яго, а ў інтарэсах вузка зразумелага нацыяналізму.

І ўсё-ж на зьезьдзе ўзяў верх той рэвалюцыйны дух, які пазьней, на справе, у бойках трох рэвалюцый давёў, што толькі бальшавікі вялі сапраўдную барацьбу за вызваленьне прыгнечаных нацыянальнасьцяй ад ярма капіталістаў.

І. Ваўкавічар.

У. Я. Чубар — кіраўнік палітычным і гаспадарчым жыцьцём Украіны.

(Пяць год на пасадзе Старшыні СНК УССР).

Прэзыдыум Усеукраінскага ЦВК аб працы У. Я. Чубара.

Мінула 5 год з дню знаходжэньня тав. У. Я. Чубара на пасадзе старшыні Савету Народных Камісараў УССР.

18 ліпеня на пасяджэньні вялікага прэзыдыуму Усеукраінскага ЦВК старшынствуючы тав. Уласенка зьвярнуўся да членаў прэзыдыуму з наступнай прамовай:

— Сёньня мінула 5 год з моманту абраньня Уласа Якубавіча Чубара на пасаду старшыні Савету Народных Камісараў. Гэта было ў ліпені 1923 году, калі мы ліквідавалі цяжкую паласу голаду, і толькі пачыналася плаўнае аднаўленьне гаспадаркі, а ўвесь наш дзяржаўны апарат яшчэ нельга было лічыць арганізацыйна досыць моцным.

У складаных абставінах барацьбы за рэарганізацыю ўсёй народнай гаспадаркі СССР, узмацненьне саюзу рабочай клясы з сялянствам і блёку незаможніка з серадняком Саветам Народных Камісараў Украіны пад кіраўніцтвам Уласа Якубава была праведена ва ўсіх гэтых галінах вялікая праца.

У працягу гэтых 5 год Улас Якубаў на пасадзе старшыні СНК выявіў сябе адным з лепшых арганізатараў савецкай улады і дасканалым кіраўніком гаспадарчага будаўніцтва ў нашай краіне. Гэтыя 5 год былі гадамі бурнага росту гаспадаркі краіны і культурнага ўзроўню мас. На гэтай вялікай і складанай працы выявіліся выключныя здольнасьці Уласа Якубава, як аднаго з кіраўнікоў усяго палітычнага і дзяржаўнага жыцьця краіны.

У. Я. ЧУБАР
Старшыня СНК УССР.

Прэзыдыум Усеукраінскага ЦВК пастанавіў паслаць тав. Чубару, які зараз знаходзіцца ў водпуску, наступную тэлеграму:

— Сёньня мінула 5 год, як партыя і ўрад вылучылі вас, дарагі Улас Якубаў, на адказнейшую пасаду старшыні Савету Народных Камісараў УССР. Горача вітаючы вас з гэтай прычыны, прэзыдыум Усеукраінскага ЦВК адзначае вялікую ролю, якую вы выконваеце ў справе здраўджэньня і ўзмацненьня украінскай пралетарскай дзяржаўнасьці і культуры, ажыцьцяўленьня на Украіне ленінскай нацыянальнай палітыкі і ў непасрэдным кіраўніцтве сацыялістычным будаўніцтвам на Украіне і ва ўсім Саюзе ССР.

Выказваючы пажаданьне шырокіх рабоча-сялянскіх мас Украіны, прэзыдыум Усеукраінскага ЦВК выказвае ўпэўненасьць, што вы яшчэ ў працягу шмат гадоў будзеце стаяць каля руля савецкай улады і будзеце працаваць над абаронай і паглыбленьнем тых заваёў, якія дала працоўным Кастрычнікавая рэвалюцыя, адным з актыўнейшых удзельнікаў і правадыроў якой вы зьяўляецеся.

Слава байцу перадавой шарнагі бальшавіцкага атраду Украіны!

Няхай жыве УССР!

Няхай жыве СССР!

Няхай жыве Пралетарская Рэвалюцыя!

Часова выконв. абавязкі старшыні Усеукраінскага ЦВК С. УЛАСЕНКА.

Часова выконв. абавязкі сэкратара Усеукраінскага ЦВК С. Буздалін.

НАГРАДА ТАВ. ЧУБАРУ.

Прэзыдыум Усеукраінскага ЦВК, у адзнаку пяцігодзьдзя з дню знаходжэньня тав. У. Я. Чубара на пасадзе старшыні СНК УССР, аднагалосна пастанавіў наградзіць яго ордэнам працоўнага сьцягу за нясупынную плённую працу ва ўсіх галінах дзяржаўнага і гаспадарчага жыцьця УССР.

Пастаноўлена таксама ўнесьці на абмеркаваньне бліжэйшай сэсіі Усеукраінскага ЦВК пытаньне аб наградзе т. У. Я. Чубара ордэнам Чырвонага Сьцягу.

ІВ. ЦЬВІКЕВІЧ.

На міжнароднай выстаўцы друку у Кёльне.

Старадаўні прыгожы горад Кёльн стаіць амаль што ў цэнтры Зах. Эўропы. Тут крыжуюцца водныя і чыгуначныя шляхі, што вельмі важна ў сэнсе рэгуліроўкі шматтысячных людзкіх хваль, якія штодня праходзяць цераз выстаўку.

ГАЛОЎНЫ БУДЫНАК ВЫСТАЎКІ.

Ад часу адчыненьня выстаўкі (12-4-28 г.) да ліпеня м-ца кёльнскую выстаўку адведала ўжо болей 1 мільёну людзей.

Немцы, як практычныя арганізатары, улічылі, што параходы Рэйна і паўтараста штодзённых цягнікоў у розныя канцы з кёльнскіх вакзалаў здолеюць абслужыць гэты вялізарны рух чалавечых мас. І трэба адзначыць што ні на вакзал, ні на прыстанёх, ні ў горадзе наогул, ні на тэрыторыі самой выстаўкі вы ня бачыце суталакі, не адчуваеце цеснаты, ня маеце патрэбы стаяць у чаргох, бо... няма іх нідзе.

Адраву, як толькі выйдзеш з цэнтральнага кёльнскага вакзалу, адчуваеш атмасфэру выставачнага сьвята. На будынках, трамвайных слупох, розных вежах, помніках і проста на спэцыяльна пастаўленых мачтах лунаюць у паветры вялізарныя рознакаляровыя сьцягі ўсіх дзяржаў сьвету. На ўсіх трамваях, што праяжджаюць каля тэрыторыі выстаўкі вісяць чырвоныя сьцяжкі з літарай „P" („Pressa») У газэтных кёсках і кніжных крамах прадаюцца паасобныя адымкі і цэлыя альбомы відаў выстаўкі; прадаюцца спэцыяльныя значкі і мэдалі на памяць аб выстаўцы; апроч звычайных газэт выходзіць штодзённая выставачная газэта („Offizielle Pressa-Zeitung der Westen"), якая раздаецца дарма.

Наўсюды чуваць гутарку на мовах розных нацый, наўсюды можна сустрэць людзей з розных канцоў зямлі, кірмашовую суталаку, чаргі каля павільёнаў і г. д. Нічога падобнага! І зразумела, бо на плошчы, памерам бадай з наш Менск, але з вуліцамі ў чатыры разы шырэйшымі, з некалькімі пляцамі ў тры—пяць разоў большымі за Пляц Волі, з будынкамі ў 4 паверхі па бакох гэтых вуліц і пляцоў—дзесяць тысяч чалавек распыліліся, і іх ня відаць.

Добрую палову месца на выстаўцы займае так званы «Vergnügungspark»—сад прыемнасьцяй. Тут удзень усё адпачывае, каб увечары да позьняе ночы тапіцца ў электрычным сьвятле, гомане і забавах.

З прыходам ночы выстаўка друку і бліжэйшая да яе частка гораду Кёльна разам з надбярэжжамі і мастамі да таго ілюмінаваны, да таго насычаны рознакаляровымі агнямі, што тут пачынаеш разумець да якой казачнай прыгожасьці можна давесьці жыцьцё дзякуючы электрыфікацыі.

Па канцах выстаўкі стаяць вежы з пражэктарамі, якія ўвесь час рухаюцца. Доўгія «белыя рукі» махаюць у цёмным небе, бы заклікаючы ўсіх на сьвята культуры, на відовішча дасягненьняў сучаснае друкарскае тэхнікі. І высака, над усім гэтым блякам і гоманам, у чорных прасторах вісяць электрычныя літары нейкай францускай рэклямы: гэта над выстаўкай падняўся ў неба балён з публікай, жадаючай ўначы з пітушнага палёту зірнуць і нацешыцца прыгожай панарамай «Кёльн ноччу».

ЭЛЕКТРЫЧНАЕ АСЬВЯТЛЕНЬНЕ НА ВЫСТАУЦЫ.

Горад Кёльн сягоньня насычаны і жыве пад знакам міжнароднай выстаўкі друку. Яна непакоіць гэты прыгожы надрэйнскі горад, прымушае яго жыць ліхарадачна, сударжна, але затое яна-ж зьбірае яму золата і хоць на пэўны час робіць яго інтэрнацыянальным горадам і цэнтрам увагі ўсяго культурнага сьвету.

І ў сэнсе зносін з горадам з вакзаламі, з прыстанямі і ў сэнсе дэкарацыйным—пляц для выстаўкі выбраны нязвычайна ўдала; знаходзіцца ён на правым беразе ракі Рэйна, на скрыжаваньні гэтай ракі з галоўнай чыгуначнай магістраллю і ў той-жа час пасярэдзіне паміж дзьвюма паловамі гораду, што ляжаць паабапал ракі. З тэрыторыі выстаўкі вы бачыце магутны Рэйн з белымі параходамі, тры вялізарных масты, адзін прыгажэй другога, бачыце на процілеглым беразе горад Кёльн з яго цудам сярэднявяковай готычнай архітэктуры—кёльнскім саборам. Гэты апошні зьдзіўляе тым, што зблізка ён захапляе вока сваёй аграмаднасьцю, вышынёй і тым, што ён нібы засьліпіць усё павокал, а здалёк гэты шэры камень гмах здаецца нейкай маленькай зграбнай цацкай з дзэнёвымі аздобамі.

Аб памерах тэрыторыі, на якой раскінуты шматлікія выставачныя павільёны, можна меркаваць хаця-б з таго, што тут пабудавана спэцыяльная кругавая чыгунка, каб развазіць адведвальнікаў. Праўда, што і чыгунка і цягнікі надта мініяцюрныя (немцы называ- «Liliputbahn»—карлікавая чыгунка), але два цягнічкі працуюць безупынна, развозячы гасьцей па розных адлеглых мясцох выставачнага пляцу.

Ведаючы, што цераз выстаўку штодня праходзіць да 10.000 чалавек, я спадзяваўся ўбачыць там тлумы народу, але гэта мне ня ўдалася. Ня ўсім, бо ня ўсім, але ня ўсім. Ня ўсім, бо ня ўсім, але ня ўсім. Ня ўсім, бо ня ўсім, але ня ўсім

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПЛЕНУМУ ЦКК КП(б)

па дакладу аб масавай рабоце ЦКК РСІ.

1. Адзначаючы, што ў сваёй рабоце органы КК-РСІ Беларусі за мінулы перыяд сталі на шлях рашучага выканаўня дырэктыў XV партыезду і II-га Пленуму ЦКК УсесКП(б) аб прыцягненні нізоў у работу Рабкрыну, аб прыцягненні рабочых да праверкі дзярж. апарату пад сваім кіраваньнем, як арганізатара мас,—Пленум ЦКК канстатуе, што па асноўных паказальніках масавай работы РСІ дасягнуты за мінулае паўгодзьдзе наступныя вынікі:

а) далейшае прыцягненьне да работы Рабкрыну праф. арганізацыяў, вытворчых і аканомкамісіяў, сэкцыяў гарсаветаў;

б) арганізацыя вакол работы бюро скаргаў прадстаўнікоў рабочых 103 прадпрыемстваў (288 рабочых засяданняў) і прыцягненьне да работы па разбору скаргаў прадстаўнікоў ЛКСМБ (216), дэлегацкіх сходаў, рабкораўскіх, прафесійных і інш. арганізацыяў, што ўвосгуле стварыла даволі значны актыў (звыш 700) удзельнікаў работы РСІ на лініі бюро скаргаў;

в) правесьці першы вопыт прыцягненьня да праверкі работы дзяржапарату і прамысловасьці абсьледавацельскіх груп і брыгад звыш 200 рабочых ад варштату, якія выдзяляліся арганізацыямі ці выбіраліся на рабочых сходах (грамадзкае харчаваньне, працоўная дысцыпліна ва ўстановах, праверка рэагаваньня на крытыку ў друку і заметкі ў насьценных газэтах і г. д.);

г) больш частае і сыстэматычнае выступленьне з дакладамі на шырокіх масавых сходах, у асаблівасьці на рабочых і партсходах (241 на ўсіх АКК і 292 прадпрыемствах ЦКК РСІ);

д) шырокае садзейнічаньне разьвіцьцю крытыкі і самакрытыкі шляхам асьвятленьня ў друку недахопаў і балячак нашага будаўніцтва як у адносінах да розных органаў, гэтак і яго прадпрыемстваў, у асаблівасьці ў лістках РСІ цэнтральных і мясцовых газэт (741 артыкул і заметак супроць 569 за ўвесь 1927 г.);

е) правядзеньне першага вопыту ўдзелу пролетарскіх мас і членаў прафсаюзаў у праверцы выкананьня дырэктыў партыі аб 20 пров. скарачэньні; прыцягненьне другога да праверкі выкананьня дырэктыў РСІ і ўдзел рабселькораў у асьвятленьні выпатыньняў асноўных работ РСІ, што зьяўляецца канкрэтнай формай садзейнічаньня і дапамогі Рабоча-Селянскай Інспэкцыі;

ж) прыцягненьне да праверкі рэагаваньня на выступленьні і прапановы рабочых партарганізацыяў, рэдкалегіяў насьценных газэт, рабкораўскіх гурткоў, шырокае ўцягненьне і ў праверку і рэагаваньне на заметкі ў друку вытворчых камісіяў, сав. ячэек, паасобных прафарганізацыяў і рэв. камісіяў.

2. Аднак, маючыяся дасягненьні, у сваёе значэньні першыя крокі на ўцягненьню мас у работу Рабкрыну. Пленум ЦКК ставіць перад органамі РСІ наступныя задачы ў далейшым:

а) палепшаньне якасьці прыцягненьня мас, арганізацыі і „навучаньня" мас задачам кантролю і прадстаўнікоў арганізацыяў, прыцягваемых у работу РСІ, шляхам сыстэматычнага скарыстаньня ўсіх існуючых форм, як сэкцыі РСІ, вытворч. і аканом. камісіі і інш;

б) неабходна шырэй прыцягнуць масавыя і грамадзкія арганізацыі і рабочых ад варштату да сыстэматычнай праверкі выкананьня дырэктыў Рабкрыну, дырэктыў партыі і сав. улады; узлічыць вопыт праверкі скарачэньня 20 пров. і зьвяшчыць усе недахопы ўдзелу мас, праяўленыя ў гэтай кампаніі;

в) лічачы недастатковымі вынікі прыцягненьня жанчын, інстытуту дэлегацкіх сходаў да работы РСІ,—у бліжэйшы час на ўзмацненьне сувязі па гэтай лініі неабходна зьвярнуць асобную ўвагу;

г) часьцей рабіць выезды для дакладаў аб рабоце РСІ на сялянскіх сходах, у асаблівасьці па лініі бюро скаргаў, паколькі інфармацыя аб рабоце РСІ сярод сялянскіх мас вагула настаўлена вельмі слаба;

д) зьвярнуць увагу ўсіх КК РСІ на невыкананьне дырэктывы 2 пленуму ЦКК УсесКП(б) аб уцягненьні ў сваю работу, апрача сэкцыяў РСІ іншых сэкцыяў гарсаветаў, а таксама аб прыцягненьні часовых заводзкіх кантрольных камісіяў.

е) прыняць меры да ўцягненьня ў работу РСІ чырвонаармейцаў і партарганізацыяў Чырвонай арміі шляхам інфармацыі аб рабоце КК РСІ і ўцягненьню ў абсьледвацельскую і праверачную работу праз сэкцыі гарсаветаў і на лініі бюро скаргаў.

3. Ідучы на шляху выкананьня дырэктывы XV партыезду аб барацьбе з правямі супраціўленьня мерапрыемствам па рацыяналізацыі дзяржапарату і вытворчасьці і з правямі „усмірэньня" актыўнасьці мас з боку бюракратычных элемэнтаў дзяржапарату,—пленум ЦКК КП(б)Б даддае ў абавязак прэзыдыуму ЦКК і АКК узмацніць сваю дзейнасьць па зьвяшчэньню гэтага супраціўленьня і праяў ігнарыраваньня Рабкрыну і арганізуемых ім мас, шкодмуючы і дыскрэдытуючы гэтыя элемэнты перад тварам пролетарскага грамадзкага зданьня, ставіць гэтыя пытаньні перад рабочымі сходамі, у друку. Адначасова пленум лічыць вусім недастатковым выкананьне дырэктывы II-га пленуму ЦКК УсесКП(б) аб перадачы „на непасрэдняе абгаварэньне ў друку і на шырокіх рабочых і сялянскіх сходах" праекты рашэньняў РСІ і КК па важнейшых, закранаючых інтарэсы шырокіх мас, пытаньнях, пленум ЦКК даручае прэзыдыуму і АКК узмацніць гэты метад удзелу мас у прапрацоўцы заканадаўчых мерапрыемстваў.

4. Зьвярнуць асаблівую ўвагу ў рабоце ЦКК РСІ і ўсіх АКК на максымальнае пашырэньне і разьвіцьцё руху дабраахвотніцтва на дапамогу РСІ, з гэткім посьпехам пачатага на пачыну НК РСІ СССР у Маскве. Дабраахвотнікі з працоўных, якія прапануюць свае веды і сілы дабраахвотна і даромна, з гэтай пары зьяўляюцца адным з важнейшых форм уцягненьня мас у работу Рабкрыну.

Сталая ўвага да кіраваньня дабраахвотнікамі, выдзяленьне дзеля іх насільных даручэньняў, у асаблівасьці на лініі бюро скаргаў, праверкі газэтных заметак і інш., сумеснае з імі абгаварэньне посьпехаў і недалікаў выкананьня даручэньняў,—вось найважнейшая задача КК РСІ.

Даручыць арг. групе ЦКК сыстэматычна правяраць дасягненьні ў разьвіцьці дабраахвотніцтва на дапамогу Рабкрыну.

5. У справе разьвіцьця дабраахвотніцтва неабходна ўсіляк заахвочваць і выкарыстоўваць рух „лёгкай кавалерыі", які, побач з агульным прыцягненьнем камсамолу, вяжа стаць адным з форм ажыцьцяўленьня Рабоча-Селянскай Інспэкцыі сіламі перадавой рабочай моладзі, пры ўмове сталай увагі да яго КК РСІ і мэтазгоднага накіраваньня ўзрастаючай актыўнасьці на справу барацьбы з бюракратызмам.

Зьяўляючыся выключна дабраахвотніцкай формай прыцягненьня камсамолу, „лёгкая кавалерыя" павінна складацца выключна на падставе асабістага жаданьня камсамольца прыняць на сябе дадатковую грамадзкую нагрузку, якая ажыцьцяўляецца „без мандату", у парадку грамадзкай ініцыятывы. Атрады будуюцца ў выглядзе груп на прадпрыемствах і ва ўстановах, пляжіх арганізацыйных інстытутаў не выдзяляецца.

У задачу канкрэтнай работы „лёгкай кавалерыі" неабходна паставіць работу над тым, каб навучыць і дапамагчы рабочаму і селяніну свайго прадпрыемства ці сяла карыстацца законамі савецкай улады, зьбіраньне скаргаў, паскараньне іх хуткага ажыцьцяўленьня і праверкі; рэагаваньне на заметкі ў насьценных газэтах і друку; выяўленьне недалікаў работы розных органаў.

Уся гэтая работа павінна выконвацца як у парадку ініцыятывы саміх груп атрадаў праз мясцовыя арганізацыі, гэтак і ў парадку даручэньняў органаў РСІ, камсамольскай газэты ці перадачы ў РСІ і газэту сваіх прапрацованых пытаньняў, матар'ялаў ці прапаноў.

Пленум ЦКК ухвалае ініцыятыву „Чырвонай Зьмены" па складаньню ў газэце лістка „лёгкай кавалерыі" ў дапамогу РСІ і даручае АКК РСІ ўсямерна выкарыстоўваць вынікі работы „лёгкай кавалерыі" ў справе барацьбы з бюракратызмам, выхоўваць членаў камсамолу ў напрамку правільнага ажыцьцяўленьня нефармальнага грамадзкага кантролю, склікаючы для гэтай мэты разам з камсамолам нарады па абагуленьню вопыту работы „лёгкай кавалерыі".

6. Разгортваньне масавай работы рабкрыну і пасьняховасьць прыцягненьня мас да непасрэднага ўдзелу ў кантроле дзяржапарату пад кіраўніцтвам РСІ патрабуе самага рашучага ўзмацненьня арганізацыйнай работы на ўсіх лініях дзейнасьці КК РСІ, дзеля гэтага неабходна:

а) устанавіць сыстэматычны вучот прыцягненьня мас па ўсіх асноўных работах КК РСІ, у мэтах абмену вопытам, праверкі сваіх дасягненьняў і недалікаў у рабоце па прыцягненьню мас; устанавіць, каб вынікі масавай работы абагульваліся ў АКК РСІ і затым у ЦКК НК РСІ правяраліся праз кожныя чатыры месяцы, абгаварваючы пытаньні мэтадаў і кіраваньня па ўцягненьню мас на нарадах з удзелам прадстаўнікоў прафарганізацыяў і на Арг. Нарадзе ЦКК;

б) узмацніць работу па падрыхтоўцы і мэтадычнаму інструктаваньню прыцягваемых да абсьледвацельскіх і праверачных работ, для чаго весьці вучот работы кожнага з іх і якасьці выкананьня даручэньняў, ставіць гэтыя пытаньні на абгаварэньне перад прыцягваемых, садзейнічаючы гэтым іх „вычуцьцю" ў справе правільнага ажыцьцяўленьня кантрольнай работы;

в) пры выбары даручэньняў прыцягваемым неабходна менш на ўвазе іх жаданьні і нахіл весьці работу ў пэўным кірунку, а таксама іх ранейшы вопыт і тэхнічную пісьменнасьць, заманоўваючы пасьлядоўнае вывучэньне імі дзейнасьці таго ці іншага апарату і маючы на ўвазе выдзяленьне з іх найбольш здольных і актыўных рабочых для вылучэньня іх на работу ў дзяржапарат.

7. Зусім слабым месцам у рабоце КК РСІ пленум адзначае садзейнічаньне арабачэньню дзяржапарату, выкананьне дырэктывы II-га пленуму ЦКК УсесКП(б), патрабуючай ад органаў КК РСІ „арганізацыйнага вылучэньня рабочых праз органы РСІ да непасрэднага кіраўніцтва дзяржапарамі", калі „масавая работа РСІ павінна стаць адным з шляхоў вылучэньства і арабачэньня апарату".

Адзначаючы станоўчы вопыт вылучэньня рабочых, якія прайшлі праз вопыт абсьледвацельскіх груп паасобных РСІ, Пленум ЦКК КП(б)Б даручае Прэзыдыуму ЦКК і АКК РСІ узмацніць работу ў гэтым напрамку, адбіраючы найбольш актыўных рабочых, удзельнічаючых у рабоце РСІ, для вылучэньня іх, рэкамэндуючы да вылучэньня лепшых прадпрыемстваў, якія выказалі „сябе сваёй актыўнасьцю, адданай работай, сувязьзю з масамі і дапамогай рабоце Рабоча-Селянскай Інспэкцыі. Гэтую работу неабходна патрабаваць, як вынік абсьледваньня ці праверкі тых ці іншых органаў, ад кожнага работніка КК РСІ.

Жыцьцё і праца асьветніка.

Крыўдзяць школу.

Шацкая сямёхгодка займае два будынкі: адзін мураваны, былыя панскія палацы, другі драўляны, пабудаваны пад трохкамплектавую 2-хкл. школу ў даваенныя часы. У мураваным будынку зьмяшчаецца другі канцэнтр сямёхгодкі, у драўляным—першы. Размешчаны яны ня разам. Мураваны будынак з паўночна-заходняга боку мястэчка, драўляны—з паўночна-ўсходняга. Месца для пабудовы драўлянага школьнага будынку адводзіў у сваім палетку былы абшарнік Гамаліцкі, якога ўсе ведаюць як надта скупога. Як скупы, ён пад школу адвёў такое месца, якое ня мела вартасьці:—дзікі ўзгорак, плошчаю ў поўдзесяціны, які паласою цягнуўся ўздоўж завулка. Палавіна гэтага ўзгорку была зьнесена і на выбраным месцы размешчаны школьны будынак, хлеў, студня вядомая сваёю вялікаю глыбінёю. Другая палова ўзгорку—жвір ды вапняк—сталі зямельнаю дзялянкай. Засаджвалі яе і садам, і засухаўстойлівымі дрэвамі і кустамі, і хлебнымі культурамі, і бульбай, але нішто ня хоча расьці на ёй.

Кастрычнік рассунуў межы гэтай дзялянкі, уключыўшы пяць дзесяцін добрай зямлі, размешчанай тут-жа пры школьным ганку.

Надышло земляўпарадкаваньне Шацкага с.-с. На біду школы ў Пухавіцкім райзямаддзеле аказаўся нейкі Сьмірноў, нічуць ня лепшы (хіба можа горшы) за абшарніка Гамаліцкага. Ён аддаў загад абрэзаць школьны вучастак пры драўляным будынку да межаў даваенных, а каб захаваць устаноўленую законам норму, прырэзаў пры мураваным будынку кавалак балота, заросшага кустамі. Такім чынам, назаўсёды застацца ў 12 кроках ад школьнага ганку студня, хлеў і ротырады, за студняю адразу плот, які хочуць зрабіць мяжою. Культурныя градкі ў паветры.

Аддаючы свой загад, т. Сьмірноў бадай адчуваў, што робіць дрэнна, бо рабіў гэта патаемна. Цяпер, як патаемнасьць выявілася, сельсавет кажа, што ня можа нічога зрабіць. Старшыня РВК раіць бараніць інтарэсы пры замацаваньні праекту, дакладваў прыехаць на месца, абсьледаваць і накіроўвае ў райзямаддзел. Райзямаддзел адказвае, што на месцы ёсьць каморнік, які як і ён адказны, і павінен зрабіць бяз крыўды. Каморнік-жа кажа, што ён два разы хадайнічаў перад Сьмірновым за школу, але апошні не згадзіўся. Цяпер-жа што небудзь зрабіць ужо позна. Ваш вучастак скора будзе разьвівацца на палосы.

Школа лічыць неабходным захаваць пры драўляным будынку за школаю плошчу ня менш гэктару, дзе-б школа магла, як належыць, разгарнуцца з будынкамі, падворкам, пляцоўкамі, градкамі і г. д.

Калі-ж у гэтым выпадку ўстаноўленая законам норма плошчы будзе парушана, няхай зямельныя органы забіраюць назад прырэзку пры мураваным будынку школы.

А. Сялівончык.

Нішчаць школьны будынак і маемасьць.

(Полацкая акруга, Расонскі райён).

У вёсны Гарбачэва ячча ўзімку згарэў будынак, у якім зьмяшчаўся с-савет, хата чытальня і народны дом.

Вядома, што ў вёсцы нялёка знайсьці такі будынак, каб зьмясьціць усе гэтыя установы, а нагэтаму прыйшлося перабраца ў будынак меншы ад згарэўшага. У гэтай вёсны маюцца дзьве школы: беларуская і польская.

Вось тады хатніца з камсамольскай ячэйкай зьвярнулася да загадчыцы польскай школы, каб дазволіць ставіць спэктаклі ў школе.

Настаўніца згадзілася, з умовай, што ячэйка будзе адказваць за нанесеныя школьнаму інвэнтару школы і будзе пасьля спэктаклю прыбіраць клясу, так як пры школе ня маецца вартаўніка.

Аднак пасьля кожнага спэктаклю зьмяшаўся лік выб у вокнах і павялічваўся лік паломаных школьных лавак.

Спачатку на заяву настаўніцы абяцалі ўсё паправіць, а пасьля ўжо сталі адказваць, што гэта не камсамольцы папсавалі, а насельніцтва.

Зачыняць фортачкі і дзьверы, тушыць лямпы прыходзілася загадчыцы школы, бо в апошнімі гукамі гармошкі кідаліся хто куды.

Настаўніцы трэба было з вучнямі, прышоўшымі ў школу, перад заняткамі, пачынаць уборку школы: разьбіраць сцэну, выносіць дошкі, расстаўляць школьныя лаўкі, падмятаць і г. д.

На прапанову хатніцы, каб ячэйка ўпадрадкавала ў клясе, яна адказала, што ёй вельмі няпрыемна, але ячэйка вельмі недысцыплінаваная, і неарганізаваная.

Цярпела настаўніца, цярпела, ды цярпеньне лопнула і кажа, што ў школе не дапусьцімы ў далейшым такія безпарадкі.

Тады ячэйка, на чале з хатніцай, сказалі, што кляса ў школе—гэта клюб і нікога і нічога яны не прызнаюць.

Прышлося настаўніцы зьвяртацца да інспэктуры, якая прапанавала, каб усякія зборышчы і вечары, ня школьнага характару, у школе забараняць.

Даведалася аб гэтым і ячэйка, але не згадзілася з прапановамі райінспэктуры і далей даводзіць настаўніцы, што гэта клюб.

Апроч таго, сталі зьдзекавацца над польскай настаўніцай у газэтах жывых і мёртвых, дайшло да таго, што 8-га ліпеня, калі настаўніца, пад час свайго летняга адпачынку, паехала на тыдзень у горад да доктара, ячэйка вымагала ў жанчыны, нанятай настаўніцай вартаваць школу, ключоў і адчыненьня школы для правядзеньня сходу і спэктакля, пры гэтым, сэкратар ячэйкі КПБ, тав. Сігоў П. награжаў вартайніцы, што выкіне яе і загадчыцу ў тры шчоты са школы і г. д.

Стварылася для настаўніцы цяжкае становішча, бо ёй патрэбна ехаць у горад лячыцца, а вартаваць школу не згаджаюцца пры такіх умовах.

Сельсавет таксама не бярэ адказнасьці за будынак, бо каму ахвота рабіць рамонт і ўборку школы, якая стаіць, як хлеў.

Асьветнік.

Тэмы дня.

Ужо даўно даведзена, што школьны рэжым адыгрывае не апошнюю ролю ў жыцьці школьніка, пагэтаму апошні (рэжым) павінен быць такім, ад якога-б ні псыхіка, ні здароўе не падлягалі небясьпецы.

Ці так яно ёсьць на справе? Далёка ня так. Як адзін з прыкладаў, возьмем спазьненьне вучняў у школу. Гэтае хворае зьявішча вельмі адчуваецца ў многалюдных школах.

Каб паправіць справу, школьнае самакіраўніцтва выносіць вымовы, даводзіць да ведама школьнае рады, а спазьненьне, калі і зьмяншаецца, то вельмі мала.

Чаму гэта так? А гэта таму, што мы ня ведаем або ня цікавімся хатнімі ўмовамі нашых „вінаватых", таксама ня ведаем, або нават ня хочам, ведаць прычыны, якія выклікаюць спазьненьне. А між іншым, прычын можа быць вельмі многа; —можа ня быць у бацькоў вучняў гадзіньніка, вучань можа быць заняты па гаспадарцы, таксама яго могуць пасласць куды-небудзь, можа затрымацца ў кааператыве, на ў свой час набудзець яго і г. д. І вось мы, замест дэтальнага вывучэньня прычын, узброіўшыся, можна сказаць, прынцыпамі старое педагогікі і мэтодыкі, марозім вучняў у калідоры, на двары, выносім вымовы і інш.

Трэба сказаць праўду, што гэта прыёмы ня сучасный савецкай педагогікі. Ці ня лепш было-б заміж вымовы і інш. прымацаваць к вучням, якія позьняцца, вучняў акуратных; я думаю, што ў такім выпадку было-б больш карысьці. Гэтым самым мы ідзем ужо к узаемнай вучнёўскай дапамозе больш моцнага слабейшаму, а гэта—элемэнт калектывізму. Да таго часу, пакуль усе віды арганізацыйна-выхавацчай працы ня будуць настаўлены на належную вышыню, будуць у школах заўважвацца выпадкі, аб якіх гаварыў Марголін у час. „Асьвета" за 1928 год, у № 4, стар. 114. Ён кажа, што на прапанову настаўніка дапамагчы слабейшаму, мацнейшы вучань адказаў: „Ці я яго настаўнік? Я-ж грошай за гэта не бяру". І калі гаварыць аб другагодніцтве, сярод іншых прычын гэтага ёла значную ролю адыгрывае адсутнасьць вучнёўскай узаемнай дапамогі больш мацнейшымі слабейшым; ясна, што дапамога гэтая павінна быць пад кіраўніцтвам настаўніка, які ў свой час павінен прыняць належныя крокі ў гэтым напрамку.

Крупская кажа: «Лепшым сродкам выхаваньня зьяўляецца правільна наладжанае калектыўнае жыцьцё, правільна наладжаная праца і таварыскія, уважлівыя адносіны к дзецям».

Вось на чым нам трэба завастрыць сваю ўвагу. Але, на вялікі жаль, на гэтым фронце ў нас ня ўсё ўпарадку. Возьмем к прыкладу, хоць-бы падлік вучнёўскай працы за год ці па трымэстрах.

Многа і вельмі многа ў гэтай працы хібаў. Перш за ўсё, паўстае пытаньне, што значыць або як разумець самы падлік працы? Адказ просты: падлічыць працу—значыць сачыць за ёю, адзначаць яе хібы і дасягненьні і на падставе тых ці іншых адзнак уносіць палепшаньне ў гэтую працу.

На справе вучот працы павінен праводзіцца так, каб ён дапамагаў вучню ў працы, выклікаў-бы да яе інтарэс, ахвоту, а не наадварот.

Аб чым гаворыць вялікая лічба непасьпяваючых вучняў?

Лічба гэтая гаворыць аб тым, што мы гонімся не за якасьцю, а за колькасьцю, пагэтаму матар'ял слабейшымі вучнямі не як след прапрацоўваецца.

Выкладаньне, як вядома, праводзіцца тым ці іншым мэтадам, пагэтаму на гэтым таксама неабходна спыніцца. Амэрыканскі прафэсар Курціс адзначае чатыры тыпы школьнае працы.

Тып прымусу. Гэта значыць, што матар'ял для лекцыі набудован лёгічна па падручніку. Матар'ял гэты дасецца вучням; вучні павінны прапрацаваць яго напамяць. Адказы аб прапрацаваным матар'яле павінны быць дакладнымі. Тут многа аддаецца ўвагі паўтарэньню, праверцы, навыкам; у клясе амаль поўная ўвага, якая тры маецца строгай дысцыплінай—адным словам, настаўнік—цар.

Тып тлумачэньня. У даным выпадку пабудова матар'яла для лекцыі залежыць ад падрыхтоўкі самога настаўніка, але падставай зьяўляецца той самы падручнік.

Настаўнік стараецца, каб тлумачэньне было зразумела для вучняў, стараецца зрабіць сваю гутарку жывою; дысцыпліна ўжо не такая строгая, як у першым выпадку.

Тып зацікаўленасьці. Тут імкненьне настаўніка накіравана ў бок узбуджэньня і падтрыманьня зацікаўленасьці вучняў; матар'ял разьбіваецца на тэмы; заўважаецца некаторы элемэнт дзіцячай самадзейнасьці; настаўнік уводзіць многа дапаўняльнага матар'яду, але лекцыі астаюцца лекцыямі вучобы; дысцыпліна слабейшая, чым у першым і другім выпадку; настаўнік і дзеці ў таварыскіх адносінах; маецца сувязь паміж паасобнымі дысцыплінамі; ня так рэзка выдзяляюцца навыкі і паверка.

Тып самастойных заданьняў. Заданьні вызначаюцца і прымаюцца вучнямі; праца ў клясе і кантроль за дысцыплінай арганізаваны дзецьмі і праводзяцца імі, а не настаўнікам; вынікі не разглядаюцца з пункту погляду фармальных ведаў і звычак; дзеці працуюць па даведніках, карыстаюцца дапаўняльным матар'ялам; вучні лічаць настаўніка часткаю групы; яны зьвяртаюцца к яму за дапамогай.

Гаворачы пра вучот працы і яго віды, мы павінны адзначыць, што самы адмоўны від вучоту—выпыты—экзамены. Стоіць толькі ўявіць сабе надворны выгляд вучня, які падлягае гэтай апэрацыі, як прад намі стане малюнак ня зусім прывабны. Перш за ўсё, на твары ахвяры чытаеш страх, голас нецьвёрды, вусім ня відаць чалавечага «я», губляецца рашучасьць—адным словам, перад вамі нявольнік і ўсё.

Мне здаецца досыць сказанага для таго, каб вывесьці належную думку пасьля ўсяго гэтага.

А. Лёсік.

ЮР. ЛЯВОННЫ.

Млын.

Ў жарнавох турпыць пшаніца,
Як шурпаты жвір ці шрот.
За ракой гукае гліца...
Мкнуцца хвалі напярод!

Сівы дах парос травою.
Млын увесь—як вадзянік...
Ўсё бурчыць: няма спакою
А ні ўночы, а ні ўдні!

Закіпай, бяздоньне вод!
Ў белай пене—
Працы зьвеньні,
Гул вясеньні
Ў лятуценьнях,—
Правяць хвалі карагод!..

А за гаем—сонца. Даль—
Посьцілкаю гладкай...
Льецца песьняю вада
За яловай гаткай.

... Рып драўляны—рып калёс.
Ветры у прасторы.
І кладуцца кроплі рос
Раніцой ля бору.

...«Ня піхайся... Знай чарод!»
Куль нясуць аж трое,
І туміць, туміць чарот
На вясёлым строі!

Ношкі збожжа... Белы пыл...
Меле млын паволі.

. . . . . .

Вяжуць сонца у снапы
На жытнёвым полі.

19-VII—28 г.

КАМСАМОЛ У ПАХОДЗЕ.

21-22 ліпеня камсамол Менску, разам з рабочай моладзью і ТДА-Авіяхімам, прарабіў манэўраны вайсковы паход.—Удзельнікі паходу дружна дэманстравалі свае сілы і баявую гатоўнасьць.

У суботу, 21 ліпеня, а 6 гадзіне ўвечары Пляц Парыскай Камуны быў бітком набіты ўдзельнікамі паходу.

Мора маладых чалавечых галоў рыхтуецца к «бою», хутка ідзе разьбіўка на роты, узводы і аддзяленьні. Пасьля гэтага кожны камандзір адводзіць свой узвод і каротка гаворыць яму аб задачах паходу, аб тым, што трэба ў паходзе быць дысцыплінаваным, выконваць усе загады камандзіраў, не таптаць сялянскіх пасеваў...

Сыгнал... Узводы становяцца на сваё месца; ідзе папярэдняя праверка; камандзіры рапартуюць свайму начальству: усё гатова і ўпарадку. Прыехала артылерыя, і вось-вось пра некалькі хвілін мы павінны рушыць у паход.

* * *

Вышлі. Нявідна ні канца ні пачатку—на некалькі вёрст расьцягнуліся калёны: гэта ішоў наш полк імя «Першага Мая». Астатнія два палкі накіраваліся другім шляхам.

Надвор'е ціхае. Неба захмарылася, і пачаў накрапваць дробны дождж. Але на наша шчасьце хмары разышліся, і мы пачалі рухацца яшчэ весялей.

Неяк няпрыкметна апынуліся за горадам, дзе значны час ішлі праз жыта.

— Лажы-с-ся... — пачуўся голас камандзіра. Усе ляглі ў канаву. Адразу—поўная цішыня: назіраем, ці далёка «сінія». Падаліся ўперад, і зноў—«лажыся!». Гэтак лажыліся некалькі раз, пакуль не дайшлі да алешніку.

А ў ім гамоняць: ці ня «вораг» там. Але ніякага „ворага" няма—перадае разьведка, гэта „нашы".

Наш полк разьбіўся на батальёны, якія накіраваліся займаць месца засады.

* * *

Месца засады нашага батальёну было ў жыце на незасеяных палосах. Астатнія батальёны палка занялі месцы крыху ніжэй нас.

Тут, у засадзе, мы павінны прабыць да раніцы, г. з. да самага «бою».

Праз некалькі хвілін разьведка даносіць аб месцы знаходжаньня «ворага». Вораг яшчэ далёка—можна крыху адпачыць. Але адпачыць мала прышлося,—трэба было ісьці то вартавым, то ў разьведку—сачыць за «ворагам».

Тут камсамольцы навочна азнаёміліся з парадкам разьведкі і вартай у баю.

Пачынала сьвітаць, а там выглянула і сонейка.

— Рыхтуйся, зараз у бой—сказаў камандзір.

Як рой падняліся байцы, падрыхтавалі вінтоўкі.

Строй-с-ся! — раздалася кароткая команда.

Падраўняліся і накіраваліся ў «бой».

* * *

Бой павінен быць адбыцца паблізку Лагойскага тракту ў зарасьніку. «Сінія» знаходзіліся па-за алешнікам.

Штаб даўно быў на месцы. Апрача вайсковых, у штабе т. т. Хацкевіч, Абрамчук, Нахільніцкі і інш.

Наш батальён разьмясьцілі на ўзгорку ў сасоньніку; два ўзводы паслалі на перадавую лінію, а адзін у тыл на падмацаваньне.

Наступалі і адступалі некалькі гадзін. Чуць было трэскатню кулямётаў і вінтовак. Перамагаем то мы «сініх», то «сінія» нас. Пераможцы з крыкам „ура" нясьліся на пераможаных.

Аэрапляны, танкі, бранявікі сваім шумам дапаўняюць гоман бою.

* * *

Бой скончыўся... Удзельнікі паходу зьбіраюцца на Лагойскім тракце: тысячы моладзі ўсялі ўсю ваколіцу.

Доўгія калёны расьцягнуліся да дарозе ў Менск. Пыл і сьпякота, але байцы ідуць бадзёра. У 12 гадзін дня—мы на Пляцу Волі.

Я. Збуржынскі.

Дзяржаўны, вандроўны.

Спачатку году тэатр пачаў сваю працу ў Мазыры.

Пасьля працы ў горадзе, тэатр, не зьвяртаючы ўвагі на марозы, якія даходзілі да 26 градусаў, выяжджае на акругу і дае 65 спэктакляў па вёсках.

З Мазыршчыны тэатр накіроўваецца на Полаччыну. Зноў бязупынная праца: 73 дні 69 спэктакляў—700 вёрст коньмі.

80.000 глядачоў—у гэтых акругах сяляне рабочае пераважна.

Не шкадуючы сіл,—артыст-вандроўца езьдзіў у такія вёскі, дзе ніхто ніколі з артыстых ня быў.

Тут глядач ня шукае шопэнаўскіх арый, ён рад, калі яму пагграе гарманік ды цымбалы.

Зьявіўся вандроўны тэатр. Загудзела моладзь, заварушыліся старыя.

Увечары сьцежкамі шкандыбаюць дзяды і бабы паглядзець на праўдзівы тэатр.

Адчынілася заслона. Цішыня—муха праляціць, чуваць. А вось глядзіш сьлёзы...

Браточкі дарагія,—кажа ўзрушаны селянін.

А песьня панясецца «калыханка», ці «каля хацінкі», сьціхае ад радасьці глядач.

Пройдуць 3-4 спэктаклі, глядзіш, як быццам дождж прайшоў пасьля сьпякоты, селянін з вялікаю пашанаю ўжо глядзіць і на артыста і на дзяржаўную маемасьць, якую ён адвозіць да мястэчка.

Ды і як не шанаваць? Артыст ня пан, па-нашаму гаворыць, і хлеба лусту, едучы на возе, разам дзелюць, а песьню запяюць у дарозе, эх... вясёлыя людзі...

Прыпынак. Начлег. Школа. На чыста вымытай падлозе ляжаць кулькі саломы, па ліку 30, кожны забірае свой кулёк і моўчкі ўкладаецца.

А ўдзень. Адны на возеры рыбу зраньня ловяць, другія малююць, дзяўчаты шыюць, вышываюць.

Галубок.

Ці варта так будаваць?

(Гом. райён, Гом. акругі).

Як існуе вёска Пыхань, насельніцтва ня бачыла ў сябе школу. Людзі, асабліва падрослі, дзічэць пачалі. Толькі пры савецкай уладзе райвыканком паставіў жорстка пытаньне аб тым, каб у Пыхані пабудаваць школу. Насельніцтва Пыхані было вельмі здаволена, —згадзіліся дапамагаць.

Закіпела работа. Старшыня с.-с., т. Шаўцоў, дык той начэй ня спаў, усё стараўся, як мага хутчэй усё патрэбнае даставіць. І вось збыліся думкі сялян Пыхані. Праз адно лета, у 1927 годзе вырасла школа. Укладзена сюды 12 тысяч р. з райённага каштарысу, сялянская праца ўжо ў лік ня ідзе.

Усё б было добра. Але ж на хвароБу здаліся гэтыя вятры з сьнегам, гэтыя завірухі паганыя, і дажджы летнія. Як пачнецца зімою завіруха, дык праз сьцены і вушакі ваконныя сьнегу ў пакоях—хоць на санках катайся, а летам ад дажджу хоць човен набывай. А вада ў дрэве хавацца і пад вокнамі бярвеньні зялёненькімі становяцца. Зялёны колер прыгож, але не на бярвеньнях будынку. Праз дзесяць год трэба будзе школьны будынак перасыпаць.

Ці варта ж так будаваць? Ці ня трэба з такіх будаўнікоў-тэхнікаў, самых пазьмяніць, каб яны лепш будавалі.

Парошын Т.

МАЛОЧНА-ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЯ КААПЭРАЦЫЯ Ў БССР.

(З І-га ўсебеларускага зьезду ўпаўнаважаных малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі).

Аднай з форм і галін каапэрацыі—ёсьць малочна-жывёлагадоўчая каапэрацыя, якая за апошнія гады пачынае выказваць асаблівае пашырэньне. Дынаміку яе росту можна бачыць з наступнае колькасьці малочных арцеляй ад пачатку іх заснаваньня: на 1-X 1924 г. іх было 29, на 1-X 1925 г.—41, на 1-X 1926 г.—79, на 1-X 1927 г.—156 і на 1-V 1928 г.—290.

Такім чынам, з 1924 г. да 1928 г. (бягучы апэрацыйны год мае яшчэ толькі першае паўгодзьдзе) колькасьць малочных арцеляй узрасла на 1000 проц.

Найбольш малочных арцеляў налічваецца ў Менскай акрузе, найменш—у Полацкай. Вось як яны разьмяркоўваюцца па акругах:

Бабруйская—48, Віцебская — 34, Гомельская—44, Менская—52, Магілеўская—47, Мазырская—23, Аршанская—30 і Полацкая—16.

У аснове неаднолькавасьці і нераўнамернасьці разьмеркаваньня ляжыць, галоўным чынам, недастаткова разгорнутая праца некаторых акрсельсаюзаў у гэтым напрамку, бо спрыяючыя ўмовы для малочнае каапэрацыі наглядаюцца ва ўсіх акругах.

Дынаміку росту колькасьці сяброў у малочных аб'яднаньнях відаць з наступнае табліцы:

У 1924 г. было 619, у 1925 г.—1867, у 1926 г.—3839, у 1927 г.—11.332 і у 1928 г. 16.000 (за першае паўгодзьдзе).

Адсюль мы бачым, што колькасьць каапэраваных сялянскіх гаспадарак на працягу чатырох гадоў павялічылася амаль у дваццаць разоў. Гэтая пасьняховасьць як найлепей сьведчыць аб жыцьцёвасьці і далейшых пэрспэктывах малочнае каапэрацыі.

Найбольш слабы тэмп росту нават за апошні год назіраецца па Мазыршчыне, але гэта, зразумела, з аб'ектыўнага боку: жывёлагадоўля Мазырскае акругі посіць амаль выключна мясны напрамак.

Аднак, ня гледзячы на такую адносную пасьняховасьць у росьце каапэраваных гаспадарак, трэба адзначыць недастатковасьць яго з абсалютнага боку і досыць будзе сказаць, што з 1.331.400 малочных кароў беларускага стада ў 1927 годзе каапэрацыя вдолела ахапіць толькі 26.036 штук, што складае толькі каля 2 проц.

Цікава адзначыць, якія слаі насельніцтва прымаюць удзел у малочнай каапэрацыі. Так, беднякоў налічваецца 22,4 проц., сераднякоў—65,5 проц. і заможнікаў—12,1 проц.

Такім чынам, серадняк складае і тут самую цэнтральную фігуру. Вынік гэтага параўнаньня зразумелы—трэба прыняць усе належныя захады, каб і другія слаі не адставалі, асабліва пролетарская частка—беднота.

Адносна ўдзелу парты

ДРУГІ КОНКУРС

Кантора газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ абвяшчае

ДРУГІ КОНКУРС

НА ЛЕПШАГА ЎПАЎНАВАЖАНАГА, ВЫЛУЧАНАГА МЯСЦКОМАМІ ЦІ ГРУПКОМАМІ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ Ў СПРАВЕ РАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ ГАЗЭТЫ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

Конкурс абвяшчаецца з 1-га жніўня і будзе цягнуцца да 31-га сьнежня г. году.

Уся прысланая ўпаўнаважанымі падпіска, пачынаючы з 1-га жніўня да 31 сьнежня, будзе залічана на конкурс. Падпіску можна зьбіраць на жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад і сьнежань месяцы г. г., а таксама і на ўвесь 1929 год.

Падпіска прымаецца ўпаўнаважанымі як за налічны разрахунак, так і ў крэдыт (крэдытная падпіска ўпаўнаважанымі праводзіцца на ранейшых умовах).

Падпіска зьбіраецца ня толькі сярод асьветнікаў, але і сярод іншага жыхарства і ўсіх устаноў і арганізацый.

УМОВЫ КОНКУРСУ:

ЗА ЗБОР ПАДПІСКІ БУДУЦЬ ВЫДАНЫ ПРЭМІІ:

За 1300 экзэмпляраместяцаў і больш прэмія 160 руб.

ад 1300 да 1150	—	140 руб.
ад 1150 да 1000	—	120 »
ад 1000 да 800	—	90 »
ад 800 да 600	—	75 »
ад 600 да 400	—	50 »
ад 400 да 300	—	30 руб.
ад 300 да 200	—	20 »
ад 200 да 100	—	бясплатна газэта «Савецкая Беларусь» на год.

Лік прэмій неабмежаваны. Такім чынам, большую прэмію могуць атрымаць некалькі ўпаўнаважаных.

Прэміі паступаюць на карысьць упаўнаважаных, а на карысьць мясцкому застаўляецца на месцы 15 проц. ад сумы падпіскі.

Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены 15 студзеня 1929 году.

ЛЁТАРЭЯ ДЛЯ ПАДПІСЧЫКАЎ.

Разам з гэтым абвяшчаецца для ўсіх падпісчыкаў лётарэя 15-ГА СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 50 КАШТОЎНЫХ РЭЧАЎ.

У лётарэі будуць удзельнічаць толькі індывідуальн. падпісчыкі (установы ўдзелу ня прымаюць)

Умовы ўдзельнічаньня ў розыгрышы:

Усе падпісаўшыяся пасьля 1 жніўня на 6 мес. атрымоўваюць 1 лётарэйны білет; на год—3 білеты. Лётарэйныя білеты будуць высланы ўсім падпісчыкам пасьля таго, як будуць імі прысланы квіткі аб здачы падпіскі, з дакладным адрасам, дзе бы яны ні падпісаліся: на почце ці ў упаўнаважаных канторы.

У ЛЁТАРЭІ БУДУЦЬ РАЗЫГРАНЫ НАСТУПНЫЯ РЭЧЫ:

1 валёсыпед
2 швайныя ножныя машыны
3 фотоапараты
2 касьцюмы
2 самавары
5 прымусаў
15 насьценных гадзіньнікаў
10 радыёпрыёмнікаў з поўным абсталяваньнем
10 камплектаў часопісі „Полымя“ на 1929 г.

У конкурсную і лётарэйную камісіі вылучаны наступныя таварышы: ад рэдакцыі—рэдактар газэты Кудзелька М., загалчык канторы Касьцюн, загалчык асьветніцкага аддзелу—Камлюк, ад ЦК саюзу працасьветы Платун і Мельнік. Апрача таго, два прадстаўнікі ад райёнаў, сабраўшых больш лік падпіскі, і прадстаўнік РСІ.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра захады да дапамогі справе вынаходніцтва.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адначыць, што ў апошнія часы наглядаецца значны рост рабочых вынаходак, што можа даць карысныя вынікі, калі гэтыя вынаходкі будуць ужывацца ў народнай гаспадарцы. У зьвязку з гэтым запрапанаваць усім дзяржаўным установам і грамадзкім арганізацыям дапамагаць выяўленьні творчай ініцыятывы рабочых і інжынэрна-тэхнічных сіл і зьвярнуць увагу на паляпшэньне ўмоў працы вынаходнікаў.

2. Для матар'яльнага забесьпячэньня справы вынаходніцтва і для матар'яльнай дапамогі паасобным вынаходнікам, утварыць пры Вышэйшым Савеце Народнай Гаспадаркі БССР спэцыяльны фонд.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі распрацаваць парадак утварэньня, скарыстаньня і сыстэматычнага папаўненьня гэтага фонду.

Асыгнаваць для арганізацыі памянёнага фонду — дзесяць тысяч (10,000) рублёў.

3. Бюро дапамогі рабочаму вынаходніцтву пры ВСНГ павінны вылучаць для скарыстаньня ў народнай гаспадарцы тыя вынаходкі, якія маюць практычнае значэньне.

4. Лічыць мэтазгодным арганізацыю бюро дапамогі рабочаму вынаходніцтву пры тых камісарыятах, якія маюць прамысловыя і гаспадарчыя прадпрыёмствы.

5. Запрапанаваць бюро дапамогі рабочаму вынаходніцтву пры ВСНГ узмацніць нагляд за прапай экспэртных камісій на прадпрыёмствах, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на рэгулярнае папаўненьне і скарыстаньне на прызначаныя мэты фондаў прэміраваньня.

6. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы з удзелам Беларускага Цэнтральнага Савету Прафэсыянальных Саюзаў устанавіць парадак прыйманьня на працу па спэцыяльнасьці зарэкамандаваўшых сябе вынаходнікаў.

7. Палегчыць вынаходнікам умовы для паступленьня ў тэхнікумы, рабочыя факультэты і вышэйшыя навучальныя ўстановы, калі ў іх ёсьць адпаведныя пасьведчаньні органаў дапамогі вынаходніцтву. Распрацоўку пытаньня ўскласьці на Народны Камісарыят Асьветы і Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі.

8. Запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам пашырыць на больш вядомых вынаходнікаў, якія далі для скарыстаньня свае вынаходкі дзяржаве, жыльлёвыя льготы, дадзеныя навуковым працаўнікам.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. Мароз.

16 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў Беларускай ССР

аб дапаўненьні пастановы СНК БССР „пра мерапрыёмствы па жыльлёвай гаспадарцы.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе дапоўніць сваю пастанову ад 23-га мая 1928 г. «пра мерапрыёмствы па жылёвай гаспадарцы» (З. З. БССР 1928 г. № 19, арт. 192) арт. 14-а ў наступнай рэдакцыі:

«Арт. 14-а. Жылёвна-арэндныя кааператыўныя таварыствы маюць пераважнае права арэндаваць муніцыпалізаваныя будынкі, у якіх жывуць члены таварыства, а таксама права аднаўляць дагавор найму перад усімі іншымі претэндэнтамі. Выняткі з гэтага правіла дазваляюцца толькі тады, калі ў даным будынку жыве ня менш 60 проц. рабочых ці служачых таго прадпрыёмства або ўстановы, якое жадае ўзяць будынак у арэнду».

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. Мароз.

23 ліпеня, 1928 г.
г. Менск.

Постановление Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР

о дополнении постановления СНК БССР „о мероприятиях по жилищному хозяйству“.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет дополнить свое постановление от 23 мая 1928 г. «о мероприятиях по жилищному хозяйству» (С.З. БССР 1928 г., № 19, ст. 192) ст. 14-а следующего содержания:

«Ст. 14-а. Жилищно-арендные кооперативные товарищества имеют преимущественное право аренды муниципализированных строений, в которых живут члены товарищества, а также право возобновления договора найма перед другими претендентами. Исключения из этого правила допускаются только в том случае, если в данном строении живет не менее 60 проц. рабочих или служащих того предприятия или учреждения, которое желает взять строение в аренду».

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР М. Карклин.
Управляющий делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР М. Мороз.

23 июля, 1928 г.
г. Минск.

Рыхтуемся да асеньняй сяўбы.

Кантрактацыя жыта.

Саюзны Наркамгандаль запрапанаваў Наркамгандлю БССР у надыходзячую асеньнюю сяўбу правесьці кантрактацыю на абшарах БССР 25 тысяч гэкт. жыта.

На міжведамсьцьвенай нарадзе пастаноўлена правесьці кантрактацыю пасеву жыта ў наступных акругах: Менскай, Бабруйскай і Гомельскай. Кантрактацыя будзе праводзіцца праз сыстэму с.-г. кааператыў.

Віцебская акруга рыхтуецца да сяўбы.

Віцебск, 23-VII. У акруговым аддзяленьні Цэнтраземскладу нядаўна надасланы: 10 штук куп'ярэзаў для мэліяцыйных т-ваў, савгасаў і калгасаў, 20 штук ільнамялак для ільнаводных райёнаў, 5 жняярак і 10 трыераў.

На складзе маюцца запасныя часткі ўсіх уборачных машын, 3000 сярпоў і інш. Крэдыты на плугі ўстаноўлены для бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак ад 3-х месяцаў да 1-го году.

У апошні час можна заўважыць вялізарны попыт з боку сялян на мінэральнае ўгнаеньне, сэпаратары.

На асеньнюю сяўбу склад забясьпечан усімі патрэбнымі с.-г. машынамі.

Каб ня было абмылкі.

Наркамзем выпісвае сёлета з савгасаў Цукратрэсту (Курскай губ.) 10 тысяч пуд. сартавога жыта, якое ў асеньнюю сяўбу будзе разьмеркавана па савгасах і калгасах. Глебавыя і кліматычныя ўмовы ў Курскай губ. значна інш., чым у БССР. У 1925 г. у БССР былі завезены—авёс «эпоха» і ячмень «прынцэса», і вынікі ўраджаю гэтых сартоў збожжа былі досыць сумныя.

Трэба падумаць загадзя аб такім масавым завозе пяткускага жыта з Курскай губ., каб і зараз не паўтарыць мінулыя абмылкі.

Попыт на мінэральнае ўгнаеньне.

Водлуг вестак Менскага Акрэа, у часе асеньняй сяўбы у акругу будзе завезена 1332 тоны мінэральнага ўгнаеньня, але гэта можа задаволіць толькі адну пятую частку попыту насельніцтва.

Завоз сартавога жыта.

У Менскую акругу ў хуткім часе будзе завезена 2500 пуд. сартавога пяткускага жыта і 250 п. насеньня азімай вікі. Апроч гэтага 9 тысяч цэнтн. жыта савгасы перададуць кааперацыі на абмен сялянству.

Ачыстка насеньня.

Сёлета ў Менскай акрузе мяркуецца ачысьціць 2200 тон насеньня. У мэтах барацьбы з пошасьцю сажы, 23 проц. насеньня пшаніцы-азімкі будзе пратраўлена арганізаваным парадкам зямельнымі органамі.

Прапаганда зяблевага ворыва.

Менскі Акрэа мяркуе правесьці сёлета ўвосені сыстэматычную прапаганду зяблевага ворыва (араць на віму). Асабліва будзе зьвернута ўвага на гэту кампанію ў Халопеніцкім, Плешчаніцкім і Бягомльскім райёнах.

Пра загатоўку другараднай сыравіны.

У сучасны момант Белдзяржгандаль заняты загатоўкай, галоўным чынам, яек, ракаў і лексыравіны. Апрача таго, Белдзяржгандаль рыхтуецца шырока разгарнуць працу па загатоўцы брусьніц для экспарту, попыт на якія на заграничным рынку забясьпечаны.

Трэба адзначыць, што попыт з экспартам брусьніц у мінулым годзе быў нязвычайны, бо тавар папсаваўся па дарозе заграніцу і прышлося прадаць яго за бясцэнак. Каб не дапусьціць памылак мінулага году, Белдзяржгандаль сёлета будзе больш паскораным тэмпам канцэнтраваць брусьніцы на пунктах адпраўкі, забясьпечваючы апошнія адпаведнай тарай. Летась для ўпакоўкі брусьніц скарыстоўваліся скрынкі, якія прызначаліся для ўпакоўкі яек; гэтыя скрынкі былі завялікія і слаба правятрываліся, таму брусьніцы і псаваліся.

Сёлета скрынкі для ўпакоўкі брусьніц падрыхтоўваюцца адпаведныя, і апрача таго яно будзе адпраўляцца заграніцу ў дубовых бочках, у якіх брусьніцы можна будзе хаваць доўгі час.

Чарговай прапай, за якую прыдзецца ўзяцца Белдзяржгандалю—гэта загатоўка для экспарту агуркоў. У гэтай галіне зьвернута асаблівая ўвага на паляпшэньне солкі агуркоў і падрыхтоўку спэцыяльных бочак. На чарзе таксама стаіць праца па загатоўцы яблык і цыбулі. Мяркуецца накіраваць заграніцу і невялікую партыю каляровай капусты, клубнікі і агрэсту. Гэтыя прадукты накіроўваюцца для высьвятленьня магчымасьці экспарту.

Посьпех кампаніі па загатоўцы брусьніц, агуркоў, яблык, цыбулі і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі будзе залежыць ад своечасовай падрыхтоўкі нізавога загатоўчага апарату, ад дакладнасьці яго працы, бо фінансаваньне загатовак недахопу ў сродках адчуваць ня будзе.

ХРОНІКА.

У Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР.

Водпуск сродкаў па ўтрыманьне дзіцячых ясьляў у Менску.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія адпусьціла 1.500 р. на ўтрыманьне дзіцячых ясьляў па гораду Менску.

Гэта дасьць магчымасьць утрымаць намечаную колькасьць дзіцячых ясьляў да канца летняга сэзону.

Пабудова школы-сямігодкі пры Ўсебеларускай Дзіцячай Камуне.

Сёлета прыступлена да пабудовы школы-сямігодкі пры Ўсебеларускай Дзіцячай Камуне.

На пабудову гэтай школы будзе адпушчана 80.000 руб., з якіх Нар. Кам. Асьветы БССР адпускае 40.000 руб.

Пабудову гэтай сямігодкі мяркуецца скончыць яшчэ ў бягучым годзе.

6.000 руб. на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

На апошнім пасяджэньні Прэзыдыуму Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі быў заслуханы даклад аб працы Гомельскага т-ва «Прыхільнік Дзяцей».

Улічваючы цяжкае матар'яльнае становішча т-ва, прэзыдыум пастанавіў адпусьціць 6.000 руб. Гэтыя сродкі дадуць магчымасьць узмацніць працу на барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю па акрузе.

У прэзыдыуме ЦСПСБ.

ЦЯЖКАЕ СТАНОВІШЧА МЕНСКАЙ СТРАХКАСЫ.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ быў абгавораны даклад аб фінансавым становішчы менскай страхкасы.

Прэзыдыум канстатаваў вельмі цяжкае становішча страхкасы і пастанавіў правесьці шэраг мерапрыёмстваў для паляпшэньня апошняга. Запрапанована страхкасе праверыць весткі, якія даюцца страхавальнікамі аб выплачваемай зарплаце і вынівіць захаваную зарплату. Разам з тым будуць прыняты срочныя меры да спагнаньня завінавачанасьці страхавых плацяжоў і пінаватыя будуць прыцягвацца да адказнасьці.

Запрапанована таксама страхкасе павялічыць колькасьць абсьледваньняў кантрольнымі ўрачамі на даму; апрача таго, усім урачам страхкасы даручана сыстэматычна вывучаць хваробы і прычыны апошняй сярод вастрахаваных. Дадзена ўказаньне страхкасе шчыльней зьвязацца з ЦП саюзаў і з фабзавкомамі для высьвятленьня асоб, якія атрымоўваюць дапамогу па бесрацоўю і адначасова працуюць на прадпрыёмствах і ва ўстановах.

Разам з тым прэзыдыум ЦСПСБ запрапанаваў Галоўсацстраху БССР у 2-хтыднёвы тэрмін вывучыць фінансавае становішча менскай страхкасы і вынікі абсьледваньня прадставіць для абгавореньня ў прэзыдыум ЦСПСБ.

КРЭДЫТАВАНЬНЕ СЛУЖАЧЫХ.

Прэзыдыум ЦСПСБ запрапанаваў Менскаму Цэрабкому абавязкова з першага жніўня распачаць крэдытаваньне працаўнікоў устаноў, якія знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэце.

УДЗЕЛ ПРАФСАЮЗАЎ У «ТЫДНІ ДАПАМОГІ БЯСПРЫТУЛЬНЫМ ДЗЕЦЯМ».

На пасяджэньні прэзыдыуму быў заслуханы даклад аб правядзеньні тыдню дапамогі бяспрытульным дзецям. Прэзыдыум ЦСПСБ запрапанаваў ЦП саюзаў прыняць самы актыўны ўдзел у гэтым «Тыдні» шляхам правядзеньня шырокай агітацыйна-тлумачальнай кампаніі па барацьбе з бяспрытульнасьцю.

Запрапанована ЦП саюзаў прыняць меры да ўцягваньня большай колькасьці рабочых і наогул членаў прафсаюзаў у таварыства «Прыхільнік дзяцей». Для ўзмацненьня фонду барацьбы з бяспрытульнасьцю дзяцей, прафарганізацыі ў час „тыдню“ будуць наладжваць вечары, спэктаклі і кіно.

Ільготы сем'ям чырвонаармейцаў.

Праўленьне Беларускай Канторы Дзяржстраху дазволіла па 10 райёнах Магілёўшчыны дадатковa аслабаніць ад узносаў плацяжоў па акладным страхаваньні сем'ям чырвонаармейцаў і былых чырвоных партызан на агульную суму у 2388 руб.

Крэдыты сялянскай бедноце.

Праўленьне Белсельбанку адпусьціла ўсім акруговым сельска-гаспадарчым крэдытным таварыствам 127450 руб. для крэдытаваньня біднейшага сялянства на набыцьцё маемасьці для грамадзян, якія перасяляюцца за межы БССР і на аплату перасяленцам арэнды за іх землі.

Выдадзена 303650 руб. на мэліярацыю.

Белсельбанк учора разьмеркаваў па акругах 38650 руб. крэдыту на гідратэхнічныя работы. Гэтыя грошы выдадзены на Саюзнаму бюджэту. Усяго-ж даготуль на мэліяцыйныя работы на Саюзнаму бюджэту ўжо адпушчана 303650 руб.

Папярэднія вынікі трохдзёньніка барацьбы з сухотамі.

Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР паказалі некаторыя вынікі кампаніі трохдзёньніка барацьбы з сухотамі.

Па папярэдніх выніках, па гораду Менску ў час трохдзёньніка было сабрана больш 1.000 руб., на Віцебскай акрузе каля 3000 р.

Усе гэтыя грошы паступяць у фонд барацьбы з сухотамі.

Да пабудовы смалярных заводаў.

Белдзяржгандаль гэтымі днямі атрымаў 120000 руб. доўгатэрміновага крэдыту на пабудову смалакураных заводаў, рызьвёвай базы і заводу на выпрацоўцы алею з ядлаўцу. Гэтыя заводы будуць працаваць для пашырэньня экспарту.

Вялікі наплыў заяў у менскі індустрыйны палітэхнікум.

Прыём заяў у менскі індустрыйны палітэхнікум пачаўся з 1-га ліпеня.

Наглядаецца вялікі наплыў жадаючых паступіць у палітэхнікум.

Ужо паступіла каля 300 заяў.

Прыступлена да пабудовы кішачных заводаў.

Нар. Кам. Гандлю БССР выдзеліў 95.000 руб. на будаўніцтва кішачных заводаў па БССР.

Згодна намечанага пляну, кішачныя заводы будуць будавацца у Менску, Гомелі і Бабруйску.

Ужо прыступлена ды пабудовы гэтых заводаў.

Рамонт шкляных заводаў.

1 жніўня пачнецца рамонт 3 шкляных заводаў Белшклотрасту.

Будуць рамантавацца заводы: „Пралетары“ (Менск), «Октябрь» (Бабруйск. акр.) і «Ільіч» (Магіл. акр.).

На рамонт гэтых заводаў будзе адпушчана 25000 р.

Рамонт працягнецца месяц і рабочым будзе прадстаўлены на гэты час водпуск.

Адначасова з гэтым, у першых лічбах жніўня прыступаюць да працы, пасьля капітальнага рамонту, шкляныя заводы «Новка» (Віцебск. акр.) і «Домбаль» (Нова-Барысаў).

Папярэднія вынікі мітынгу-пераклічкі МЦРК.

За час з 25 чэрвеня да 19 ліпеня ў кампанію, мітынгу-пераклічкі менскі Цэрабком уноў кааперываў 1353 чал. і сабраў 15670 руб. паявых узносаў. За гэты-ж перыяд па ўсіх гандлёвых пунктах менскага ЦРК паступіла ад 50 чалавек 1800 руб. укладаў.

Загатоўка фруктаў для экспарту.

Белсельтрэст заключыў дагавор з управай Дзяржгандлю БССР на загатоўку для экспарту замежы 120000 пуд. фруктаў—яблык і груш.

Галоўным чынам будзе экспартавацца антонаўка.

Загатоўка фруктаў будзе весьціся ў савгасах.

Дапамога паступаючым у навучальныя ўстановы.

Па хадайніцтву ЦБ пралетстуду, Нар. Кам. Асьветы БССР адпусьціў 1500 руб. для аказаньня дапамогі паступаючым у навучальныя ўстановы.

Гэтыя сродкі будуць разьмеркаваны паміж навучальных устаноў БССР.

Менскі дзень.

Цэнтральная бульбяная станцыя пры Беларускім Дасьледчым Інстытуце сельскай і лясной гаспадаркі арганізуецца ў савгасе Вялікая Сяляпянка (недалёка ад Менску).

15-га жніўня заканчваецца лятэрны збор студэнтаў 2-га курсу ўсіх факультэтаў Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

70.000 прышчэпаў—яблынь і груш будзе сёлета адпушчана з пітомніку Белсельтрэсту насельніцтву БССР.

150.000 руб. адпушчана калектыўным гаспадаркам для падрыхтоўкі да васеньняй пасеўнай кампаніі. Сродкі гэтыя адпусьціў Белсельбанк.

150 дзяцей батрачак савецкіх гаспадарак Меншчыны знаходзяцца ў летніх дзіцячых ясьлях.

Каля 60 невялікіх райённых электрастанцый мяркуецца пабудаваць у працягу пяці год з агульнай моцнасьцю звыш 3000 кілёват.

Вядзецца праца па пабудове кантрольнага апарату на менскай тэлефоннай станцыі, што дасьць магчымасьць палепшыць колькасьць непаразуменьняў з абанэнтамі.

Сёлета скончыла прафшколы Беларусі 680 чалавек, в іх 173 дзяцей рабочых. У наступным годзе будзе прынята па ўсіх прафшколах 935 чалавек.

5-гадовы плян ВСНГ прадугледжвае пабудову 74 новых прадпрыёмстваў. Галоўнае будаўніцтва разгорнецца ў працягу бліжэйшых двох гадоў.

„Пасадзім чырвонаармейца на матор“.

Па ініцыятыве ячэйкі ТДА-Авіяхіму калектыў працаўнікоў Наркамгандлю правёў збор сродкаў на маторызацыю Чырвонай армії. Збор праходзіў пад лёзунгам—„пасадзім чырвонаармейца на матор“. Не зважаючы на тое, што значны лік працаўнікоў Наркамгандлю знаходзіцца ў водпуску, усё-ж сабрана на гэту мэту 37 руб. 25 кап. Грошы ўнесены на бягучы рахунак ТДА-Авіяхіму.

Абсьледваньне супрацьпажарнай аховы на прадпрыёмствах.

Белдзяржстрах распачаў абсьледваньне прамысловых прадпрыёмстваў ВСНГ БССР і мясцовай прамысловасьці. Гэта абсьледваньне праводзіцца для высьвятленьня добраякасьнасьці пастановаў супрацьпажарнай аховы на прадпрыёмствах. Абсьледваньне распачалося ў ліпені бягучага году і працягнецца да красавіка 1929 году.

Арганізацыя справачнага стала для паступаючых у БДУ

Пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце арганізован справачны стол для жадаючых сёлета паступіць у БДУ.

Апошнім будуць выдавацца ўсялякія справкі па пытаньнях зьвязаных з паступленьнем.

258290 пасажыраў перавезена на аўтабусах за чэрвень.

Па маючыхся вестках, за чэрвень м-ц перавезена на аўтабусах, якія курсыруюць па гораду Менску, 258290 пасажыраў.

З гэтай колькасьці на лініі вакзал МБВ—Камароўка перавезена 177441 пасажыр. і па лініі Старажоўка — Серабранка—80849 пасажыраў.

Абавязковыя заняткі па фізкультуры.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту пастанавіла спачатку надыходзячага навучальнага году ўвесьці ў вучэбны плян для студэнтаў 1 і 2 курсаў усіх факультэтаў абавязковыя заняткі па фізвыху.

Гэта дасьць магчымасьць падняць фізычнае разьвіцьцё сярод студэнцтва БДУ.

6050 руб. яўрзям-земляробам.

Белсельбанк адпусьціў для крэдытаваньня яўрэяў-земляробаў дадаткова 6050 руб. З гэтай сумы адпушчана—2050 руб. Бабруйскае, 1500 руб.—Магілеўшчыне і 3000 руб. Менскай акрузе.

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі.

Цэнтраземскład падрыхтоўваўся да ўборачнай кампаніі. Так, загатоўлена 93000 кос, (з якіх каля 60 проц. ужо прадазена) 78000 сярпоў (40-45 проц. ужо прададзена).

Апроч таго, закуплена 257 жатак і 67 касілак.

Сёлета асаблівы попыт прад'яўляўся на жаткі.

Сельская гаспадарка.

Праца Менскай Дасьледчай Расьлінаводнай Станцыі.

Менская Дасьледчая Расьлінаводная Станцыя зьяўляецца сур'ёзнай навукова-дасьледчай інстытуцыяй. Вопытныя яе палі раскіданы ў 3-х мясцох: па 2-й Стара-Віленскай вуліцы, у савгасах Малая Сьлепня і Толіне (каля Прылук). Па 2-й Стара-Віленскай вуліцы заняты пад розныя культуры 35 гэкт. Тут знаходзіцца вэгітацыйны павільён, сэлекцыйныя гадавальнікі. У Сьлепні праводзіцца сорта-прабаваньне кармавых і цукравых буракоў, вывучаецца ўплыў на рост і ўраджайнасьць палявых і гародных культур розных сартоў фасфарытаў (беларускі, расейскі і інш.), суперфасфатаў, тамасоўкі і інш. У савгасе Толіне таксама праводзіцца вывучэньне ўплыву на рост і ўраджайнасьць расьлін розных мінэральных угнаеньняў, сортапрабаваньне кармовага і піваварнага ячменю, аўсоў, пшаніц азімкі і ярушкі, жыта і інш.

Па 5-цігадоваму перспэктыўнаму пляну адбудовы сельскай гаспадаркі ў Малой Сьлепні і Прылуках будзе сканцэнтравана ўся праца Менскай Дасьледчай Расьлінаводнай Станцыі. Тут будуць пабудаваны патрэбныя лябараторыі, розныя будынкі і кватэры для навуковага і абслугоўваючага персаналу.

Пабудова станцыі будзе каштаваць 419 тысяч руб.

Арганізацыя малочна-жывёлаводнага саюзу.

15-га ліпеня адбыўся ўстаноўчы зьезд Менскага акруговага малочна-жывёлаводнага саюзу. На зьезд прыехалі 80 прадстаўнікоў з месц. Саюз яднае ўсе малочныя, жывёлаводныя і птушыныя т-вы. З гэтага часу малочна-жывёлаводны саюз будзе складаць самастойную кааперацыйную арганізацыю.

Конкурс на лепшую малочнасьць.

Менскі акрэа абвясьціў конкурс на лепшую малочнасьць і чыстату малака. За лепшую якасьць малака і чыстае ўтрыманьне яго будуць выдавацца прэміі.

Суд.

Як Апацкі пагуляў з лесам.

Мікола Апацкі—селянін вёскі Масьціча, Смалявіцкага райёну. Сяляне лічылі яго сумленным і абралі ўпаўнаважаным над лясамі мясцовага значэньня.

На Меншчыне, мусіць, ня знойдзецца другога такога «сабра» лясоў, якім аказаўся Апацкі.

Дабрата Апацкага складалася з таго, што ён лічыў сябе кампэтэнтнай асобай у ласной справе, на яго думцы, яноў зьвяраўлася ўласнасьць на лясы, і што ён, як упаўнаважаны, можа кіраваць і карыстацца лесам, як былы ўласьнік дарэвалюцыйнага часу.

На сялянскіх сходах вельмі часта стаялі пытаньні аб мясцовых лясох; беднякі заўсёды даказвалі Апацкаму, што на лясы і зямлю ўласнасьці няма і ня можа быць, як гэта было пры старым рэжыме, але Апацкі з гэтымі довадамі не згаджаўся. Ён падпадаў пад уплыў кулакоў, ранейшых уласьнікаў лясоў і казаў:

— Калі, значыцца, мясцовы лес, дык ён наш, і мы гаспадары, а не лясьніцтва.

Увесь час сваёй службы Апацкі ехаў з сынамі ў лес і рубаў каштоўныя дрэвы—будаваў новыя будынкі.

Адначасова былыя ўласьнікі лесу Рамашкевіч, Ланцёнак і іншыя бралі з Апацкага прыклад і таксама ехалі ў лес і рубалі, каму што было трэба і ня трэба.

Калі „гульня“ з лесам зайшла ўжо вельмі далёка, калі яна зрабілася ня гульнёй, а стыхійным нішчэньнем лясного багацьця, некатарыя сяляне зварачаліся да кампэтэнтнай асобы, Апацкага, і пыталіся:

— А скажы, Мікола, ці з гэтага дрэнная нічога ня выйдзе?

— Што тут можа быць дрэннага? Што захопіш,—будзе тваё.

У лес ехалі ўсе. Ехалі тыя кулакі, лес якім быў непатрэбен і, урэшце, мясцовы лес аказаўся высечаным на суму 2500 р.

Менскі акружны суд прыгаварыў Мікалая Міхаёвага Апацкага на два гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на два гады. Дастаўшы амністыю ў адзнаку 10 гадавіны Кастрычніцкае рэвалюцыі, суд скараціў пакараньне да аднаго году з суровым адмежаваньнем.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Забойства з-за глупства.

Грамадз. вёскі Паляны, Барысаўскага райёну Язэп Муха 10 студзеня 1928 году паспрачаўся на вечарынцы з аднавяскоўцам Васілём Хмелем, які калісь пабіў бацьку Язэпа Мухі. У момант спрэчкі Муха схапіў сякеру і ўдарыў ею Хмеля, ад якога Хлель Васіль праз суткі і памёр.

Суд прыгаварыў: Язэпа Муху на пяць г. зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і спагнаньнем на карысьць дзяцей забітага на 12 р. у месяц да дасягненьня імі паўналецьця.

Вынік нядбайства.

Грамадз. вёскі Дрычына, Пухавіцкага райёну, Іван Макавец займаў пасаду начнога вартаўніка пры краме Дрычынскага спажывецкага т-ва, але на варту ніколі не хадзіў, а пасылаў вместа сябе старога бацьку, ці малодшага брата, якія спалі па ноч. У выніку гэтага ўночы на 3-га сакавіка сёл. г. з крамы пакрадзеныя тавары на суму 622 р. Суд прыгаварыў Івана Макаўца на адзін год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

Старшыня—растрачык.

Калінкавічы, 23-VII. Доўгі час сяляне Ліпоўскага с-с., Калінкавіцкага райёну пакутвалі з прычыны неадрамантаваных гробляў і мастоў. Калі правялі самаабкладаньне, сяляне казалі:

—Ну, цяпер коні больш сабе ногі ламаць ня будуць.

Парашылі купіць пажарную машыну, пабудаваць лазьню і г. д. Шпарка прыняўся за гэтую працу старшыня сельсавету т. Кавалёў. Падпісаў з грамадзянамі цэлы шэраг умоў на падрэды на рамонту. Прымаў ад сялян грошы і г. д. Спачатку ўсё ішло добра, але хутка т. Кавалёў забыў дзеля якое мэты грошы ад самаабкладаньня яму былі даручаны. Калі брат Кавалёва паехаў на Кубань ён пазычыў нейкую суму грошай, надышоў тэрмін плацяжа і Кавалёў узяў 200 руб. з сумы па самаабкладаньні і заплаціў доўг. Была зроблена рэвізія, якая выявіла недахват у Кавалёва грошай больш 300 руб. У гэтую справу ўмяшалася сьледчая ўлада і ў хуткім часе пралетарскі суд напомніць Кавалёву для якое мэты сяляне яго сельсавету абкладаліся.

Апавяшчэньні.

САД АСЬВЕТЫ.

Сёньня кіно-сэанс, пачатак а 10 гадз. Білеты 10 і 15 кап.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня а 7-ай гадзіне ўвечары адбудзецца зачынены сход ячэйкі КП(б)Б Працасьветы.

Паштовая скрынка.

Цікаваму. Ваш допіс «Спайка защитников революционной законности» накіравана Пракурору Рэспублікі.

Свайму—селяніну. Заметка «Земляўпарадкаўчае балота» накіравана ў Менскі акр. зем. аддзел.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК (НА 23-VII 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—51, куп. 4—59.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—15, куп. 5—13.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—06, куп. 5—04.
Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 25,94, куп. 25—84.
Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 121—75, куп. 119—75.
Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 101—81, куп. 101—76.
Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 25—11 куп. 25—01.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР—КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71.	Ад аўторка—24 ліпеня. Новы бытавы фільм „МЯРЭЖЫ“ (кружэва) У 7 частках.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“.	Савецкі мастацкі фільм АМОК трагэдыя ў 6 частках. па раману Л. Цвэйга. Пачатак у 7 в пазав. гадз.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	Выдатны савецкі фільм ХТО ТЫ ТАКІ? Драма ў 6 частках.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Толькі 3 дні—24, 25 і 26 ліпеня. Замежны фільм МАРСКІ ЯСТРАБ Кіно-раман у 9 частках.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ, КАЛЬКУЛЯЦИИ И СТАТИСТИКИ

ПРИ Ц. К. С. Б.

— Продолжительность курса—8 МЕСЯЦЕВ. —

Поступать на курсы можно в любой месяц года.

Принимаются лица с образованием не ниже 4 гр. семилетки.

ОКОНЧИВШИМ КУРСЫ ВЫДАЮТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВА.

Плата за первый месяц—5 руб, а за остальные по 4 руб. в месяц ВНОСИТСЯ В НАЧАЛЕ КАЖДОГО МЕСЯЦА ВПЕРЕД по адресу: МИНСК, ВСЕКОБАНК, тек. счет № 682.

Подробные условия